# МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ МОВЫ

## ЧАСТКА 2



Магілёў 2021

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

метод. каб

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
імя А. А. КУЛЯШОВА"

# МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ МОВЫ

Матэрыялы лекцый

У трох частках

ЧАСТКА 2

*Аўтар-складальнік*
А. В. Грышчанкова

Магілёў
МДУ імя А. А. Куляшова
2021

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

БІБЛІЯТЭКА
МГУ
218 /бр

УДК 811.161.3(075.32)
ББК 81.411.3я72
М54

*Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета
МДУ імя А. А. Куляшова*

Р э ц э н з е н т
выкладчык вышэйшай катэгорыі
*С. В. Старавойтава*

**Методыка развіцця мовы** : матэрыялы лекцый : у 3 ч. /
М54 аўтар-складальнік А. В. Грышчанкова. – Магілёў : МДУ імя
А. А. Куляшова, 2021. – Ч. 2. – 64 с.
ISBN 978-985-568-830-4

Дадзенае выданне мае тэарэтыка-практычную накіраванасць і прызначана для рэалізацыі патрабаванняў тыпавой праграмы па вучэбнай дысцыпліне “Методыка развіцця мовы”. Яго мэта – раскрыць сістэму, змест і метады маўленчага развіцця дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту.

Адрасавана навучэнцам педагагічных каледжаў па спецыяльнасці “Дашкольная адукацыя”.

Частка 1 выйшла ў выдавецтве МДУ імя А. А. Куляшова ў 2020 годзе.

**УДК 811.161.3(075.32)**
**ББК 81.411.3я72**

**ISBN 978-985-568-830-4-2**
**ISBN 978-985-568-696-6**

© Грышчанкова А. В., складанне, 2021
© МДУ імя А. А. Куляшова, 2021

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРАДМОВА

Развіццё маўлення – складаная галіна методыкі роднай мовы. Авалодаць яе асновамі будучы педагог зможа толькі тады, калі набудзе веды па развіцці маўлення дашкольнікаў, пазнаёміцца з псіхалагічнымі асаблівасцямі засваення дзецьмі мовы і маўлення, авалодае педагагічнымі тэхналогіямі.

Матэрыялы лекцый распрацаваны ў адпаведнасці з праграмай па методыцы развіцця мовы для педагагічных каледжаў і мае задачу дапамагчы навучэнцам засвоіць тэорыю навучання, авалодаць уменнямі правільна арганізоўваць вучэбна-выхаваўчы працэс і кіраваць пазнавальнай дзейнасцю дашкольнікаў.

Курс “Методыка развіцця мовы. Частка II” уключае лекцыйны матэрыял па двух раздзелах: “Методыка фарміравання граматычнага ладу маўлення”, “Методыка выхавання гукавой культуры маўлення”. Кожны раздзел завяршаецца пытаннямі для паўтарэння і тэставымі заданнямі, а таксама прапаноўваюцца гульні і практыкаванні, накіраваныя на фарміраванне граматычнага ладу маўлення і развіццё гукавой культуры маўлення дашкольнікаў.

Пры складанні матэрыялаў у якасці асноўнай літаратуры былі выкарыстаны падручнікі і вучэбныя дапаможнікі такіх аўтараў, як Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна, М.М. Аляксеева, В.І. Яшына і інш.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

РАЗДЗЕЛ 1

# МЕТОДЫКА ФАРМІРАВАННЯ ГРАМАТЫЧНАГА ЛАДУ МАЎЛЕННЯ

Лекцыя 1

## Значэнне засваення граматычнага ладу мовы для развіцця маўлення дзяцей

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*1.1. Паняцце пра граматычны лад маўлення і перыяды яго фарміравання ў дашкольнікаў.*

*1.2. Асаблівасці засваення граматычнага ладу маўлення дашкольнікамі.*

*1.3. Задачы граматычнай работы ў дзіцячым садзе.*

### 1.1. Паняцце пра граматычны лад маўлення і перыяды яго фарміравання ў дашкольнікаў

***Граматычны лад маўлення*** – гэта сукупнасць ведаў і ўменняў, якія неабходны чалавеку, каб ствараць выказванні самому і разумець выказванні іншых.

***Граматычны лад маўлення ўключае ў сябе*** марфалагічны лад, сінтаксічны лад і словаўтварэнне.

***Марфалагічны лад*** уключае ў сябе змяненне слоў па формах (*скланенне назоўнікаў, спражэнне дзеясловаў, змяненне прыметнікаў па родзе і ліку пры дапасаванні іх да назоўнікаў* і г.д.).

***Сінтаксічны лад*** прадугледжвае ўменне злучаць словы ў выказванні, будаваць розныя тыпы сказаў.

***Словаўтварэнне*** – гэта ўменне ўтвараць словы пры дапамозе суфіксаў *(хлеб – хлебніца)*, прыставак *(ляцеў – адляцеў, прыляцеў)*, ствараць складаныя словы з двух простых *(доўгія вушы – даўгавухі)*.

У засваенні дзіцём граматычнага ладу маўлення вылучаюць тры перыяды:

***Першы перыяд** (1 год 3 месяцы – 1 год 10 месяцаў)* – ***даграматычны*** – перыяд ужывання слоў-сказаў і сказаў з 2-3 слоў, якія граматычна не звязаны паміж сабой.

***Другі перыяд** (1 год 10 месяцаў – 3 гады)* – перыяд засваення граматычнай структуры сказа.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Трэці перыяд*** (3–7 гадоў) – перыяд засваення марфалагічнай сістэмы роднай мовы.

### 1.2. Асаблівасці засваення граматычнага ладу маўлення дашкольнікамі

***У раннім узросце*** дзеці спачатку засвойваюць словы у той форме, у якой іх пачулі. У перыяд ад двух да трох гадоў дзеці, як правіла, ужываюць якую-небудзь адну граматычную форму для называння значэнняў, якія ў мове перадаюцца рознымі граматычнымі формамі. Такім чынам, з'яўляюцца памылкі па аналогіі (*птушкі ляцюць* – па аналогіі з *птушкі дзяўбуць*; *гуляе з палачкам* – па аналогіі *гуляе з мячыкам*).

***У другой малодшай групе*** дзеці з дапамогай дыдактычных гульняў практыкуюцца ў правільным дапасаванні слоў у родзе, ліку, склоне, разуменні і ўжыванні прыназоўнікаў. Дашкольнікі вучацца ўжываць назвы знаёмых прадметаў у правільнай форме: множным ліку (*дрэва – дрэвы*), давальным склоне (*дай Ваню цацку*), месным склоне (*на вадзе, у руцэ*) і інш. Ставіцца задача – навучыць дзяцей утвараць і актыўна выкарыстоўваць прыналежныя і параўнальныя прыметнікі, звяртаць увагу на правільнае ўжыванне форм загаднага ладу дзеясловаў, розных форм дзеясловаў *есці*, *даць*, *хацець*. Дзеці вучацца заўважаць словаўтваральныя сувязі (*ручнік для рук*). Асаблівая ўвага звяртаецца на суаднясенне назваў жывёл і іх дзіцянят.

***У сярэдняй групе*** дзеці далей вучацца дапасоўваць словы ў сказах. Асабліва назоўнікі на *г*, *к*, *х* (*дарога – у дарозе*, *рука – у руцэ*). Вучацца правільна ўжываць формы займеннікаў *цябе – табе*, *сябе – сабе*. У сярэдняй групе ўвага надаецца ўтварэнню назваў дзіцянят жывёл у адзіночным і множным ліку, назваў прадметаў посуду, парадкавых лічэбнікаў. Звяртаецца ўвага на розныя спосабы ўтварэння некаторых груп слоў (для хлеба – *хлебніца*, для цукру – *цукарніца*, але для чая – *чайнік*).

Важнай асаблівасцю маўлення дашкольнікаў складае дзіцячая словатворчасць. У ёй праяўляецца здольнасць дзяцей ствараць неалагізмы (*стрэль-стрэль*, *стрыжульня* і інш.). К 5–6 гадам словатворчасць пачынае гаснуць, бо дзіця ўжо трывала засвойвае граматычныя формы.

***У старэйшай групе*** **працягваецца работа па навучэнні дзяцей словазмяненню і словаўтварэнню.** Дзеці вучацца выкарыстоўваць розныя суфіксы для ўтварэння назваў жывёл (*ліса*, *ліска*, *лісанька*,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*лісіца-хітрыца*), прафесій (*спявак, мастак, будаўнік*), вучацца ўжываць формы слоў са значэннем адзінкавасці (*бульбіна, цыбуліна*), складаць словы на падставе двух простых слоў (доўгія вухі – *даўгавухі*, кароткі хвост – *караткахвосты*) і, наадварот, тлумачыць сэнс незнаёмых слоў (*гарналыжнік* – чалавек, які катаецца на горных лыжах). На занятках вялікае месца займаюць праблемныя моўныя задачы, у працэсе рашэння якіх дзеці вучацца самастойна, у пэўнай меры творча выкарыстоўваць свой вопыт, эксперыментаваць са словам (*мышаня, казляня*), дашкольнікі спрабуюць утварыць назвы дзіцянят незнаёмых або малазнаёмых жывёл (*малпа, жыраф, бегемот*).

У дашкольным узросце ў дзяцей паступова ўзбагачаецца і ***ўдакладняецца сінтаксічны бок маўлення.***

У маўленні дзяцей малодшага школьнага ўзросту пераважаюць простыя сказы.

У сярэднім дашкольным узросце на-ранейшаму пераважаюць простыя сказы, але структура іх ускладняецца: з'яўляюцца сказы з аднароднымі членамі. Дзеці паступова засвойваюць складаназалежныя сказы, але часта могуць прапускаць злучнік (*Пабудавала, вось, хатку і сказала, вось, не адчыняць нікому*), выкарыстоўваюць абагульняльныя словы пры аднародных членах (*Мама купіла новыя цацкі: коціка і сабачку*).

У мове старэйшых дашкольнікаў павялічваецца колькасць развітых сказаў з аднароднымі членамі, аб'ём складаных сказаў. Дзіця авалодвае амаль усімі злучнікамі і правіламі іх ужывання, ужывае абагульняючыя словы. Але ў самастойным маўленні дзеці рэдка ўжываюць усе тыпы сказаў, часта дапускаюць памылкі ў дапасаванні.

### 1.3. Задачы граматычнай работы ў дзіцячым садзе

Задачы граматычнай работы разглядаюцца ў трох накірунках:

1. Практычна засвоіць марфалагічную сістэму роднай мовы (змяненне па родах, ліках, асобах, часе).

2. Навучыць правільнаму дапасаванню слоў у сказе, пабудове сказаў розных тыпаў і іх спалучэнню ў звязны тэкст.

3. Паведаміць пра некаторыя нормы ўтварэння формаў слоў.

Граматычны лад маўлення дзеці засвойваюць практычна, на аснове ўспрымання маўленчых узораў, якія дашкольнікі неўсвядомлена аналізуюць, і ў працэсе спецыяльна арганізаванага навучання.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Лекцыя 2

# Фарміраванне граматычнай правільнасці маўлення дашкольнікаў

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*2.1. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі элементамі маўлення.*

*2.2. Заняткі па фарміраванні граматычнага ладу маўлення.*

*2.3. Фарміраванне граматычнага ладу маўлення па-за спецыяльнымі заняткамі.*

## 2.1. Этапы авалодання дзецьмі граматычнымі элементамі маўлення

Дзеці засвойваюць граматычныя формы роднай мовы ў пэўнай паслядоўнасці, якая дыктуецца патрабаваннямі зносін з дарослымі і аднагодкамі, а таксама лёгкасцю ці цяжкасцю іх засваення. Аналіз паказвае, што дзеці ідуць ад менш абстрактных, канкрэтных форм да больш абстрактных (множны лік, памяншальнасць, склонавыя формы і г.д.).

Па ўзроставых групах змест работы па граматыцы размяркоўваецца вучэбнай праграмай дашкольнай адукацыі.

Авалоданне дзецьмі граматычнымі элементамі маўлення адбываецца на аснове фарміравання наглядных уяўленняў. Напрыклад, дзіця засвойвае назвы асобных жывёл, затым, заўважыўшы, што жывёлы адрозніваюцца па памеры, пачынае шукаць у мове спосабы адлюстравання гэтых адрозненняў. Гэта складаны шлях, на якім можна вылучыць **тры этапы**.

1. Спачатку адбываецца арыенціроўка дзіцяці на гукавую форму слова (*коцік*, *зайчык*, *мядзведзік*).

2. На другім этапе заўважаецца неўсвядомленае ўстанаўленне дзіцем агульнай гукавой формы, аднолькавай у розных словах (*-ік*, *-ык*), злучэнне гэтай формы з нейкім элементам, з'явай рэчаіснасці (маленькая істота).

3. Нарэшце, на апошнім этапе адбываецца ўстанаўленне "жорсткай сувязі" гукакомплексу з дадзенай з'явай і як вынік гэтага – перанос дадзенага гукакомплексу на ўсе словы для абазначэння дадзенай з'явы (маленькі бегемот – *бегемоцік*, маленькі слон – *слонік*).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

## 2.2. Заняткі па фарміраванні граматычнага ладу маўлення

Фарміраванне граматычна правільнага маўлення ажыццяўляецца ў двух напрамках – развіццё маўлення і выпрацоўка граматычных навыкаў у штодзённых зносінах.

Спецыяльныя заняткі даюць магчымасць папярэдзіць граматычныя памылкі дзяцей, а ў штодзённым жыцці ствараюцца ўмовы для практычнага замацавання ведаў, набытых на занятках.

На спецыяльных занятках дзеці засвойваюць граматычныя формы, якія нельга засвоіць у штодзённых зносінах: дзеці вучаца змяняць словы (марфалогія), будаваць сказы (сінтаксіс) і ўтвараць формы слоў (словаўтварэнне).

У дзіцячым садзе сярод заняткаў, накіраваных на авалоданне дзяцей граматычнымі навыкамі, можна вылучыць комплексныя і тэматычныя заняткі .

***Комплексныя заняткі*** – гэта заняткі, на якіх, акрамя фарміравання граматычных навыкаў, вядзецца іншая работа: слоўнікавая работа, работа па фарміраванні гукавой культуры (вучацца вымаўляць гукі), развіцці маўлення і інш.

***Тэматычныя заняткі*** праводзяцца прыкладна адзін-два разы ў квартал. На іх вырашаюцца задачы, накіраваныя толькі на фарміраванне граматычнага ладу маўлення. На гэтых занятках замацоўваюцца веды, якія дзеці атрымалі на комплексных занятках, і ўключаюцца новыя задачы навучання.

## 2.3. Фарміраванне граматычнага ладу маўлення па-за спецыяльнымі заняткамі

Праца па-за заняткамі праводзіцца па трох напрамках:

- у штодзённым жыцці на немаўленчых занятках выпраўленне граматычных памылак у маўленні дзяцей;
- індывідуальная праца з дзецьмі;
- праца з бацькамі.

У штодзённым жыцці на немаўленчых занятках выхавальнік непрыкметна для дзяцей праводзіць работу па фарміраванні граматычнага ладу маўлення.

Пры азнаямленні з прыродай дзеці практыкуюцца: ва ўжыванні вышэйшай і найвышэйшай ступеняў прыметніка: (восенню дні *кара-*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*цейшыя*, а ночы – *даўжэйшыя*; зімой – *самыя кароткія* дні, *самыя доўгія* ночы), ва ўжыванні дзеясловаў (восенню – лісце *ападае*, трава жаўцее; вясной – *набухаюць* пупышкі, распускаецца лісце, *зацвітаюць* кветкі).

У працэсе развіцця элементарных матэматычных уяўленняў дзеці практыкуюцца ў правільным спалучэнні лічэбнікаў і назоўнікаў: пяць алоўкаў, шэсць качанят, тры вожыкі, пяць вожыкаў; вызначаючы велічыню прадмета, утвараюць параўнальную ступень прыметніка: *даўжэй*, *карацей*, *вышэй*, *ніжэй*.

На занятках па мастацтве знаёмім дзяцей са словам *напарстак*, тлумачым яго значэнне, вучым ужываць у мове *(Гэта напарстак. Яго надзяваюць на сярэдні палец, калі шыюць. Напарсткам прасоўваюць іголку скрозь тканіну. Без напарстка можна ўкалоць пальчык)*.

У час прагулак, экскурсій звяртаем увагу дзяцей на з'явы, якія абазначаюцца аднакаранёвымі словамі (Паглядзіце, які мяккі снег. Як яго можна назваць? – (Сняжок). А як называецца камячок снегу? – (Сняжок). Што можна зляпіць са снегу? – (Снегавіка)).

Важнай умовай фарміравання граматычна правільнага маўлення ў дзяцей з'яўляецца тактоўнае выпраўленне граматычных памылак. Не трэба паўтараць памылку, лепш некалькі разоў вымавіць правільную форму, звярнуўшы на яе ўвагу дзіцяці: "Паслухай, як трэба казаць: чысцей, даўжэй, прыгажэй".

Важна, каб дзеці пад кіраўніцтвам выхавальніка вучыліся чуць і самастойна выпраўляць памылкі ў сваім маўленні, імкнуліся гаварыць правільна.

Педагог назірае за памылкамі дзяцей, фіксуе іх, плануе індывідуальную ці калектыўную работу па выпраўленні памылак і іх папярэджванні (падбірае гульні, практыкаванні).

Уся праца па развіцці маўлення, як і любая іншая праца, накіраваная на развіццё дзяцей, не можа быць паспяховай, калі ў ёй прымае ўдзел толькі дашкольная ўстанова, без падтрымкі сям'і. Педагог павінен пазнаёміць бацькоў з відамі граматычных памылак дзяцей і рэкамендаваць розныя дыдактычныя гульні па іх ліквідацыі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Лекцыя 3

## Метады і прыёмы фарміравання граматычнай правільнасці маўлення

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*3.1. Метады фарміравання граматычнай правільнасці маўлення.*

*3.2. Прыёмы фарміравання граматычнай правільнасці маўлення.*

### 3.1. Метады фарміравання граматычнай правільнасці маўлення

Да метадаў фарміравання граматычных паняццяў адносяцца дыдактычныя гульні, гульні-драматызацыі, слоўныя практыкаванні, разглядванне карцін, пераказ кароткіх апавяданняў і казак. Гэтыя метады могуць выступаць і ў якасці прыёмаў пры выкарыстанні іншых метадаў.

Дыдактычныя гульні і гульні-драматызацыі праводзяцца, галоўным чынам, з дзецьмі малодшага і сярэдняга ўзросту, практыкаванні – пераважна з дзецьмі старэйшага дашкольнага ўзросту

***Дыдактычныя гульні*** – эфектыўны сродак замацавання граматычных навыкаў, яны даюць магчымасць шмат разоў практыкаваць дзіцяці ў паўтарэнні патрэбных словаформаў. Дыдактычныя гульні дазваляюць мэтанакіравана знаёміць дзяцей з пэўнымі марфалагічнымі і сінтаксічнымі канструкцыямі, фарміраваць у іх уменне адвольна выкарыстоўваць граматычныя сродкі ва ўласным маўленні. Дыдактычныя гульні могуць праводзіцца як з цацкамі, прадметамі і малюнкамі, так і без нагляднага матэрыялу – у форме славесных гульняў, пабудаваных на словах і дзеяннях.

У кожнай дыдактычнай гульні выразна вызначаецца праграмны змест. Напрыклад, у гульні “Хто пайшоў і хто прыйшоў?” замацоўваецца правільнае ўжыванне назваў жывёл і іх дзіцянят у назоўным склоне адзіночнага і множнага ліку. У адпаведнасці з дыдактычнай задачай (праграмным зместам) адбіраюцца цацкі, з якімі можна лёгка выконваць разнастайныя дзеянні, утвараючы патрэбную граматычную форму.

***Існуюць абавязковыя патрабаванні да нагляднага матэрыялу:***

1) ён павінен быць знаёмы дзецям;

2) павінен быць аформлены эстэтычна;

3) выклікаць канкрэтныя вобразы;

4) заахвочваць думаць.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Перад гульнёй разглядаюцца цацкі, слоўнік дзяцей актывізуецца за кошт назваў колеру, формы, прызначэння цацак, дзеянняў, якія можна з ім рабіць.

***Гульні-драматызацыі*** адрозніваюцца тым, што ў іх разыгрываюцца сцэнкі (міні-спектаклі) з цацкамі. Спачатку рэжысёрам бывае сам выхавальнік, пазней рэжысёрам становіцца дзіця. Гульні такога роду даюць магчымасць для прайгравання пэўных жыццёвых сітуацый, у якіх дзеці практыкуюцца ва ўжыванні прыназоўнікаў, змяненні дзеясловаў, дапасаванні назоўнікаў да прыметнікаў

Прыкладам можа служыць гульня-драматызацыя “Дзень нараджэння лялькі”. У Машы дзень нараджэння. Да яе павінны прыйсці госці. Трэба накрыць стол для чаю. Паставім вялікі самавар, заварачны чайнік. Які ён? Вялікі ці маленькі? З чаго Машыны сябры будуць піць чай? (З кубкаў.) Прыгожыя кубкі паставім на стол. Чаго яшчэ няма? (Сподкаў.) Кубак павінен быць са сподкам. Што яшчэ трэба паставіць на стол? і гэтак далей. Калі прыйдуць госці, іх трэба будзе пасадзіць за стол. Зайка сядзе на стул, Мішка – у крэсла, Маша – на канапу і г. д.

Асноўныя педагагічныя патрабаванні да гэтага метаду аналагічныя тым, якія прад’яўляюцца і да дыдактычных гульняў.

***Спецыяльныя практыкаванні*** накіраваны на фарміраванне граматычных навыкаў у галіне марфалогіі, сінтаксісу і словаўтварэння. Вялікае значэнне лагічным практыкаванням ў навучанні школьнікаў надаваў К. Д. Ушынскі. Ён справядліва лічыў, што практыкаванні больш за ўсё падрыхтоўваюць дзіцяці да вывучэння граматыкі. Ім распрацаваны ўзоры такіх практыкаванняў для першапачатковага вывучэння роднай мовы.

Прывядзём прыклады. Словаўтварэнне: гняздо птушкі – *птушынае гняздо*, хвост каня – *конскі хвост*, хвост лісы – *лісіны хвост*, лапа мядзведзя – *мядзведжая лапа.*

Е. І. Ціхеевай былі распрацаваны практыкаванні для развіцця граматычных навыкаў дашкольнікаў.

***Разглядванне карцін,*** у асноўным сюжэтных, выкарыстоўваецца для фарміравання ўмення будаваць простыя і складаныя сказы.

***Пераказ кароткіх апавяданняў і казак*** – каштоўны сродак для навучання дзяцей пабудове сказаў, бо сам мастацкі твор з’яўляецца ўзорам правільнай у граматычным дачыненні мовы. Заняткі па навучанні дзяцей пераказу ўзбагачаюць мову, развіваюць паслядоўнасць і лагічнасць мыслення і гаворкі. У працэсе пераказу дзеці запазычваюць складаныя граматычныя канструкцыі аўтарскага тэксту.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Назіранне і гутарка.*** У працэсе назіранняў выхавальнік вучыць дзяцей разглядваць прадмет, устанаўліваць істотныя сувязі паміж прадмстамі і з'явамі, прычынныя і часавыя адносіны і выказваць іх у маўленні.

**3.2. Прыёмы фарміравання граматычнай правільнасці маўлення**

Метадычныя прыёмы разнастайныя, яны вызначаюцца зместам заняткаў, ступенню навізны матэрыялу, моўнымі асаблівасцямі дзяцей, іх узростам.

Вядучымі прыёмамі навучання граматычным навыкам можна назваць ***узор, тлумачэнне, указанне, параўнанне, паўтарэнне***. Яны папярэджваюць памылкі дзяцей, дапамагаюць засяродзіць увагу дзіцяці на правільнай форме слова ці канструкцыі сказа.

***Узор*** правільнага маўлення педагога адыгрывае важную ролю на першапачатковых этапах навучання. Дзецям прапануюць павучыцца правільна вымаўляць словы, запомніць іх: *зняць (што?) – паліто, але распрануць (каго?) – ляльку.*

***Тлумачэнне,*** як неабходна ўжываць цяжкія формы. Напрыклад: усе словы змяняюцца, але ёсць такія, як *паліто*, *кіно*, *метро*, *радыё*, якія ніколі не змяняюцца, таму трэба казаць: *адно паліто на вешалцы*; *шмат паліто*. Гэтыя словы трэба запомніць.

***Параўнанне*** двух формаў (*алоўкаў – апельсінаў – груш*).

Для трывалага запамінання цяжкай формы ўжываецца **шматразовае паўтарэнне** яе дзецьмі ўслед за педагогам, разам з ім, хорам і па адным.

Выкарыстоўваюцца і такія прыёмы, як стварэнне праблемных сітуацый; звароты патрэбнай формы; выпраўленне памылкі; пытанні падсказваючага і ацэначнага характару; прыцягненне дзяцей да выпраўлення памылак; напамін аб тым, як сказаць правільна і інш.

Лекцыя 4

## Тыповыя граматычныя памылкі ў маўленні дашкольнікаў і шляхі іх пераадолення

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*4.1. Прычыны ўзнікнення граматычных памылак у маўленні дзяцей.*

*4.2. Тыповыя граматычныя памылкі ў маўленні дзяцей дашкольнага ўзросту.*

*4.3. Методыка выпраўлення граматычных памылак у маўленні дзяцей.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## 4.1. Прычыны ўзнікнення граматычных памылак у маўленні дзяцей

Авалоданне роднай мовай як сродкам і спосабам зносін і пазнання з'яўляецца адным з самых важных набыткаў дзіцяці ў дашкольным узросце. Калі пэўны ўзровень авалодання роднай мовай не дасягнуты да 5–6 гадоў, то гэты шлях, як правіла, не можа быць паспяхова пройдзены на пазнейшых узроставых этапах.

А.М. Гвоздзеў адзначаў, што тры асноўныя часціны мовы з'яўляюцца дастаткова цяжкімі для засваення дашкольнікамі: у адносінах да назоўнікаў найбольш цяжка адбываецца засваенне канчаткаў, у адносінах да дзеясловаў – авалоданне асновамі, у адносінах да прыметнікаў – словаўтварэнне (ступень параўнання).

Цяжкасці і паступовасць засваення граматычнага ладу можна растлумачыць некалькімі прычынамі:

• асаблівасцямі ўзросту;

• уплывам рускай мовы;

• заканамернасцямі засваення марфалагічнага і сінтаксічнага бакоў маўлення;

• складанасцю граматычнай сістэмы, асабліва марфалогіі, дзеці дрэнна засвойваюць шматлікасць утварэння граматычных форм.

І ў рускай, і ў беларускай мовах шмат нетыповых форм, г.зн. выключэнняў з правіл. Ужываючы нетыповыя формы, дзеці часта памыляюцца. А таксама вельмі часта ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага двухмоўя дашкольнікі пераносяць асаблівасці граматычнага ладу адной мовы ў другую. Напрыклад, слова *сабака* ў рускай мове мае жаночы род, а ў беларускай – мужчынскі, у сувязі з гэтым дзеці вельмі часта дапускаюць памылкі пры дапасаванні прыметнікаў да дадзенага назоўніка. Такіх адрозненняў у граматычным ладзе моў нямнога, але яны ёсць, і дзеці, асабліва пры няправільных адносінах педагога да навучання дашкольнікаў дзвюм мовам, дапускаюць памылкі.

Адной з прычын памылак дзяцей можа служыць педагагічная запушчанасць, калі педагог не звяртае ўвагі на граматычныя памылкі дзяцей і з дашкольнікамі не праводзіцца праца па выпраўленні памылак у граматычным ладзе маўлення. Важную ролю ў фарміраванні граматычнага ладу маўлення дашкольнікаў, як ужо гаварылася, адыгрывае прыклад дарослых.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

### 4.2. Тыповыя граматычныя памылкі ў маўленні дзяцей дашкольнага ўзросту

Усе памылкі можна падзяліць на ***марфалагічныя*** і ***сінтаксічныя***.

***Марфалагічныя памылкі*** ў маўленні дзяцей:

1. Няправільныя канчаткі назоўнікаў (*лялькав, дзяўчынкав*; *каля носе, посадзілі дуба* і інш.)

2. Скланенне нескланяльных назоўнікаў (*на піяніне, у кіне*).

3. Памылкі пры ўтварэнні множнага ліку назоўнікаў, што называюць дзяцей жывёл (*ягнёнкі, парасёнкі*).

4. Змешванне форм множнага ліку назоўнікаў: замест канчатка -і (-ы) дзеці вымаўляюць -а (-я) (*дама, стала, вокна* замест *дамы, сталы, вокны*).

5. Змена роду назоўнікаў (*вялікае яблык, тата пайшла, цёплая малако*).

6. Няправільнае ўтварэнне дзеяслоўных форм:

• загадны лад (*скакай, спяй, ехай*);

• змена асновы дзеяслова (*плакаю, маляваю, можу*);

• змяненне дзеясловаў (*дадзіш, ядаеш, спліш*).

7. Утварэнне няправільнай формы дзеепрыметнікаў (*сломатая, абарватая, сашытая*).

8. Адсутнасць чаргаванняў зычных у каранях прыметнікаў пры ўтварэнні ступені параўнання (*яркее, глухее*).

9. Няправільныя канчаткі займеннікаў ва ўскосных склонах: *у меня баляць вушы, у табе новая сукенка, у гэтым кішэні.*

10. Скланенне лічэбнікаў (*двое хат, з двумямі, сям'ю*).

У дзяцей назіраюцца, асабліва ў штодзённых зносінах, і іншыя памылкі, выкліканыя асаблівасцямі мясцовых гаворак, дыялектным маўленнем навакольных, а таксама і іншыя памылкі, якія залежаць ад таго, у якой сям'і жыве дзіця. Трэба адзначыць тое, што дыялектныя памылкі ў маўленні дзяцей ліквідаваць значна цяжэй, паколькі дзіця ўвесь час чуе такое маўленне дарослых дома, а магчыма, і ў дзіцячым садзе.

***Сінтаксічныя памылкі*** ў маўленні дзяцей дашкольнага ўзросту:

1. У парушэнні парадку слоў у сказе:

• на першае месца ставіцца найбольш важнае для дзіцяці слова (*Ляльку мама прынесла*);

• пытальныя сказы пачынаюцца з таго, што для дзіцяці важней (*Заплакала Маша чаму?*);

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

• дзеці часта пачынаюць свой адказ з пытальнага слова, таму на пытанне *чаму*? адказваюць: *чаму што*.

2. У няправільным афармленні злучнікавай сувязі:

• апускаецца злучнік або частка злучніка (*Вось яшчэ лопнуў шар у дзядзькі, таму націснуў моцна*);

• адзін злучнік замяняецца іншым (*Як мы прыйшлі дадому, мы гулялі з мячом*; *Я надзела цёплую футра, чаму што на вуліцы холадна*);

• злучнік ставіцца не на тым месцы, дзе звычайна ўжываецца (*Мы ішлі вось калі ад цёткі Тамары, глядзім – салют*).

Нявыпраўленая граматычная памылка – лішняе падмацаванне няправільных умоўных сувязей не толькі ў гаворачага дзіцяці, але і ў іншых дзяцей, якія чуюць яго ў дадзены момант.

### 4.3. Методыка выпраўлення граматычных памылак

Неабходна выхоўваць у дзіцяці ўважлівае стаўленне да мовы, уменне "адчуваць" памылку не толькі ў чужым, але і ва ўласным маўленні. Самастойнае выпраўленне ўласных памылак – паказчык досыць высокага ўзроўню авалодання граматычным бокам мовы і ўсведамлення з'яў мовы і маўлення.

Выпраўленне памылак ажыццяўляецца на ўсіх занятках (а не толькі па развіцці маўлення).

Методыка выпраўлення памылак распрацавана В. І. Салаўёвай, А. М. Бародзіч. Асноўныя яе палажэнні можна сфармуляваць наступным чынам.

Выпраўленне памылак спрыяе таму, што дзеці ўсведамляюць моўныя нормы, г. зн. засвойваюць, як трэба казаць правільна.

Нявыпраўленая граматычная памылка – лішняе падмацаванне няправільных умоўных сувязей як у таго дзіцяці, якое кажа, так і ў тых дзяцей, якія яго чуюць.

Не паўтараць за дзіцём няправільную форму, а прапаноўваць яму падумаць, як сказаць правільна (Ты памыліўся, трэба сказаць *"мы хочам"*). Такім чынам, трэба адразу даць дзіцяці ўзор правільнага вымаўлення і прапанаваць паўтарыць яго.

Выпраўленне на занятках робіцца гучна, каб яго ўспрынялі ўсе дзеці. Часам (асабліва ў старшых групах) дастаткова заўвагі (*Ты зноў сказаў няправільна*!), пытання-нагадвання (*Ты забыўся, як трэба казаць слова **паліто***?), неадабральнага погляду ці жэсту. Пажадана, каб выхавальнік патлумачыў дзецям, што не трэба крыўдзіцца на аднагодкаў,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

якія выпраўляюць памылку, бо яны хочуць дапамагчы навучыцца гаварыць правільна, дакладна.

Памылкі варта выпраўляць тактоўна, добразычліва і не ў момант прыпаднятага эмацыйнага стану дзіцяці. Дапушчальна выпраўленне памылак не адразу, а праз пэўны прамежак часу.

З дзецьмі малодшага ўзросту выпраўленне граматычных памылак заключаецца ў асноўным у тым, што выхавальнік, выпраўляючы памылку, па-іншаму фармулюе фразу або словазлучэнне. Напрыклад, дзіця сказала: *Мы паставілі на стол талерку і шмат кубкаў і лыжкаў.* – "Правільна, вы добра накрылі стол да чаю, паклалі шмат *лыжак* і паставілі шмат кубкаў", – пацвярджае выхавальнік.

Дзяцей старэйшага ўзросту неабходна вучыць чуць памылкі і самастойна выпраўляць іх. Прыёмы тут магчымы розныя. Напрыклад: "Ты няправільна змяніў слова, падумай, як змяніць яго правільна".

Можна даць ўзор аналагічнага змянення слова (родны склон множнага ліку – *матрошак, кніжак*).

У якасці ўзору выкарыстоўваецца прыклад правільнага вымаўлення аднаго з дзяцей. У рэдкіх выпадках вельмі асцярожна дзецям прапаноўваюць самім выправіць памылку.

Пры выпраўленні дзіцячых памылак не трэба быць вельмі дакучлівымі, неабходна ўлічваць становішча, быць уважлівымі і чулымі суразмоўцамі. Прывядзём прыклады: дзіця чымсьці засмучана, яно скардзіцца выхавальніку, хоча ад яго дапамогі, парады, але дапускае моўную памылку; дзіця гуляе, яно узбуджана, штосьці кажа і пры гэтым робіць памылкі; дзіця ўпершыню адважылася прачытаць верш на памяць. Яно выйшла на сярэдзіну пакоя, пачало дэкламаваць, але стала дапускаць граматычныя памылкі.

Ці варта папраўляць дзяцей у такія моманты? Вядома, не варта. Выхавальнік фіксуе сваю ўвагу на памылках, каб пазней выправіць іх у больш зручных абставінах.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

## Гульні і гульнявыя заданні, накіраваныя на фарміраванне граматычнага ладу маўлення дашкольнікаў

### "Адзін – шмат"

*Мэта:* навучыць дзяцей утвараць назоўнікі назоўнага склону множнага ліку. Наглядны матэрыял: прадметныя малюнкі – словы ў адзіночным і множным ліку.

*Ход гульні:* дзецям дэманструецца малюнак з выявай аднаго прадмета і прапаноўваецца знайсці карцінку з выявай гэтага ж прадмета, але ў большай колькасці.

Маўленчы матэрыял: *У мяне чырвоны шар. А ў мяне чырвоныя шары.*

### "З якога дрэва ўпаў лісток?"

*Мэта:* замацаваць назвы дрэў, форму роднага склону адзіночнага ліку з прыназоўнікам *с*. Наглядны матэрыял: прадметныя малюнкі.

*Ход гульні:* раздаюцца карткі з выявай лісця дрэў. Дзеці павінны вызначыць, лісце якіх дрэў у іх апынуліся, і назваць дрэва: *Мой ліст упаў з клёну.*

### "Што каму патрэбна для працы?"

*Мэта:* замацаванне тэмы "Прафесіі", засваенне давальнага склону ў адзіным і множным ліку.

*Наглядны матэрыял:* прадметныя малюнкі.

1. *Ход гульні:* дзецям раздаюцца карцінкі, на якіх намаляваны настаўнік без указкі, маляр без пэндзля, цырульнік без нажніц і г.д. Затым кожнае дзіця павінна ўстаць, паказаць сваю карцінку і сказаць: *У мяне настаўнік без указкі, яму трэба даць указку* і г.д.

2. *Ход гульні:* на дошку вывешваюцца карцінкі, на якіх намаляваны дзяўчынкі, мядзведзі, сабачкі г.д., а дзецям раздаюцца карцінкі з прадметамі (кніжка, цукерка, мяч і г.д.). Кожнае дзіця павінна падысці са сваім малюнкам і выбраць, каму ён што дасць.

*Маўленчы матэрыял:* Я дам цукерку дзяўчынкам; Я дам кнігу мядзведзікам.

### "Хто самы назіральны"

*Мэта:* развіць у дзяцей увагу, памяць, актыўны слоўнік.

*Ход гульні:* дзеці павінны паглядзець, што знаходзіцца вакол, і назваць больш прадметаў поўнымі сказамі. Першае дзіця называе ў адзіночным ліку, а другое паўтарае ў множным ліку.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Маўленчы матэрыял:* Я бачу стол, акно, крэсла ... – Я бачу сталы, вокны, крэслы ...

**“Што чым робяць?”**

*Мэта:* пашырыць слоўнікавы запас, навучыць складаць словазлучэнні і спалучаць дзеясловў з назоўнікам, засвоіць форму творнага склону множнага ліку.

*Наглядны матэрыял:* прадметныя малюнкі.

*Ход гульні:* дзецям раздаюцца прадметныя малюнкі з выявай інструментаў у множным ліку: пілы, сякеры, рыдлёўкі, іголкі, нажы, нажніцы і г.д. Дзецям неабходна скласці словазлучэнні, адказваючы на пытанне “Чым пілуюць (капаюць, шыюць, рэжуць і г.д.)?”.

**Гульнявое практыкаванне “Закончы сказы”**

*Мэта:* фарміраванне навыкаў на супастаўленне дзеясловаў адзіночнага ліку ў трох асобах: 1-й, 2-й і 3-й.

*Ход гульні:* педагог пачынае гутарку ад 1-й асобы, потым звяртаецца да першага дзіцяці, і яно адказвае ад 2-й асобы, да трэцяга, а яно адказвае ад 3-й.

*Маўленчы матэрыял:* Я іду. – Ты ... (ідзеш). – Ён ... (ідзе); Я стаю. – Ты ... (стаіш). – Ён ... (стаіць); Я будую дом. – Ты ... (будуеш дом). – Ён ... (будуе дом); Я сплю. – Ты ... (спіш). – Ён ... (спіць).

**Дыдактычная гульня “Вялікі – маленькі”**

*Мэта:* навучыць дзяцей ўтвараць назоўнікі пры дапамозе памяншальна-ласкальных суфіксаў.

*Наглядны матэрыял:* прадметныя малюнкі.

*Ход гульні:* на дошку вывешваюцца кругі – вялікі і маленькі, а дзецям раздаюцца карцінкі з выявай прадметаў. Кожнае дзіця па чарзе выходзіць да дошкі, называе спачатку вялікі прадмет пад вялікім кругам, а затым маленькі пад маленькім.

**Гульня “Нарыхтоўкі на зіму”**

*Мэта:* замацаваць тэму “Садавіна”, навучыць дзяцей ўтвараць адносныя прыметнікі ад назвы садавіны.

*Наглядны матэрыял:* прадметныя малюнкі.

*Ход гульні:* дзецям раздаюцца карцінкі з выявай садавіны, і педагог тлумачыць, што з садавіны можна зрабіць на зіму нарыхтоўкі. Гэта



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

можа быць варэнне, сок, кампот, салата. Задаюцца пытанні, і дзеці адказваюць па сваіх малюнках.

*Маўленчы матэрыял:* – Які сок можна прыгатаваць з яблыкаў (мандарынаў, чарніц, маліны, персікаў, абрыкосаў)?; – Якое варэнне можна прыгатаваць з вішні (яблыкаў, груш, сліў)?

**Гульнявое практыкаванне "Падкажы дзеянні"**

*Мэта:* навучыць дзяцей ўтвараць і правільна ўжываць дзеяслоў *ехаць* з рознымі прыстаўкамі.

*Наглядны матэрыял:* цацачная машынка.

*Ход гульні:* дзецям паказваюць дзеянні з машынкай і пачаць сказ, а дзеці павінны працягнуць яго і назваць дзеянне.

*Маўленчы матэрыял:* Машына ад дома ... (ад'ехала); Машына па дарозе ... (паехала); Машына да моста ... (пад'ехала); Машына на мост ... (уз'ехала); Машына з моста ... (з'ехала); Машына дрэва ... (аб'ехала).

**Гульнявое практыкаванне "Страшны звер"**

*Мэта:* фарміраваць уменне суадносіць назвы жывёл і іх дзіцянят.

*Наглядны матэрыял:* прадметныя малюнкі.

*Ход гульні*: зачытваецца апавяданне, на месцы пропуску слова робіцца паўза, педагог паказвае карцінкі, дзеці павінны ўставіць неабходныя па сэнсе словы.

*Маўленчы матэрыял*: "У дзяўчынкі Вары была кошка з ... (кацянятамі), сабака са ... (шчанятамі), качка з ... (качанятамі), курыца з ... (куранятамі), каза з ... (казлянятамі). Аднойчы качаняты пабеглі да ракі, сталі плаваць і ныраць, а кацяняты, кураняты, шчаняты і казляняты глядзелі на іх. Раптам чуюць: "Тра-та-та!" Спалохаліся малыя і пабеглі да сваіх мам. Кацяняты да ... (кошкі), шчаняты да ... (сабакі), качаняты да ... (качкі), кураняты да ... (курыцы), казляняты да ... (казы).

**Гульнявое практыкаванне "Чый, чыя, чыё?"**

*Мэта:* фарміраваць уменні ўтвараць прыналежныя прыметнікі.

*Наглядны матэрыял:* прадметныя малюнкі і цацкі.

*Ход гульні:* **1 варыянт.** На дошку вывешваюцца карцінкі з выявамі жывёл, а дзецям раздаюцца карцінкі асобных іх частак (хвост, лапа, вушы). Дзеці па чарзе выходзяць да дошкі і называюць, якой жывёліне належыць частка цела.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**2 варыянт.** Паказваецца дзецям цацка і задаюцца пытанні: Чый?, Чыя?, Чые?

**Гульня "Даскажы сказ"**

*Мэта:* навучыць дзяцей утвараць ад прыметнікаў параўнальную ступень.

*Ход гульні:* Зачытваецца сказ, а дзеці павінны яго закончыць.

*Маўленчы матэрыял:* Вова моцны, а яго брат яшчэ ... (мацнейшы); Вясной надвор'е цёплае, а ўлетку яшчэ ... (цяплейшае); У Лены шарф доўгі, а ў Каці яшчэ ... (даўжэйшы); Вечар цёмны, а ноч яшчэ ... (цямнейшая); Марозіва смачнае, а цукерка яшчэ ... (смачнейшая).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Пытанні для наўтарэння і абагульнення

1. Раскрыйце змест паняцця “граматычны лад маўлення”.
2. Якія перыяды вылучаюць у засваенні дзіцём граматычнага ладу маўлення. Ахарактарызуйце кожны з іх.
3. Раскрыйце асаблівасці засваення граматычнага ладу маўлення дашкольнікамі.
4. Пералічыце асноўныя задачы па арганізацыі работы і фарміраванні граматычнага ладу ў дашкольнікаў.
5. Назавіце этапы авалодання дзецьмі граматычнымі элементамі маўлення.
6. Як арганізуецца работа па фарміраванні граматычнага ладу маўлення на занятках і па-за спецыяльнымі занямткамі.
7. Пералічыце асноўныя метады фарміравання граматычнай правільнасці маўлення.
8. Назавіце прыёмы фарміравання граматычнай правільнасці маўлення.
9. Прывядзіце прыклады дыдактычных гульняў і практыкаванняў па фарміраванні ў дашкольнікаў навыкаў словазмянення.
10. Прывядзіце прыклады дыдактычных гульняў і практыкаванняў па фарміраванні ў дашкольнікаў навыкаў злучэння слоў у сказы.
11. Прывядзіце прыклады дыдактычных гульняў і практыкаванняў па фарміраванні ў дашкольнікаў навыкаў словаўтварэння.
12. Пералічыце, якія тыповыя граматычныя памылкі сустракаюцца ў маўленні дзяцей дашкольнага ўзросту.
13. Назавіце прычыны ўзнікнення граматычных памылак у маўленні дзяцей.
14. Як правільна арганізаваць работу па выпраўленні граматычных памылак у маўленні дзяцей.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Тэставае заданне па тэме "Граматычны лад маўлення"

**1. Граматычны лад маўлення** – гэта…

а) сукупнасць усіх слоў якой-небудзь мовы;

б) сукупнасць ведаў і ўменняў, якія неабходны чалавеку, каб ствараць выказванні самому;

в) сукупнасць ведаў і ўменняў, якія неабходны чалавеку, каб разумець выказванні іншых.

**2. Граматычны лад маўлення ўключае ў сябе**:

а) марфалагічны лад, б) пунктуацыйны лад; в) лексічны лад; г) сінтаксічны лад; д) словаўтварэнне.

**3. Суаднясіце паняцці і тое, што яны азначаюць:**

| | |
|---|---|
| *1) **Марфалагічны лад*** уключае ў сябе…. | а) гэта ўменне ўтвараць словы пры дапамозе суфіксаў, прыставак, уменне утвараць складаныя словы з двух простых |
| *2) **Словаўтварэнне*** – гэта … | б) уменне злучаць словы ў выказванні, будаваць розныя тыпы сказаў. |
| *3) **Сінтаксічны лад*** прадугледжвае … | в) змяненне слоў па формах (скланенне, спражэнне, змяненне па родзе, ліку і т.д.). |

**4.** Якія асноўныя перыяды вылучаюць лінгвісты ў фарміраванні граматычнага ладу маўлення дашкольнікаў?

а) ад 2 да 5;

б) 1,3–1,10; 1,10–3; 3–7;

в) 1 да 7, ад 7 да 9 год.

**5. Задачы граматычнай работы ў дзіцячым садзе:**

1) Дапамагчы дзецям практычна асвоіць лексічную сістэму роднай мовы.

2) Дапамагчы дзецям практычна асвоіць марфалагічную сістэму роднай мовы.

3) Дапамагчы дзецям у авалоданні сінтаксічнай сістэмай роднай мовы.

4) Дапамагчы дзецям практычна асвоіць пунктуацыйную сістэму роднай мовы.

5) Паведаміць веды аб некаторых нормах ўтварэння формаў слоў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**6. Фарміраванне граматычна правільнага маўлення ажыццяўляецца:**

а) толькі на занятках па развіцці маўлення; б) у штодзённых зносінах; в) на занятках па развіцці маўлення і па-за спецыяльнымі заняткамі.

**7. Пра якія від заняткаў гаворыцца ў выказванні:**

Праводзяцца прыкладна адзін-два разы ў квартал. На іх вырашаюцца задачы, накіраваныя толькі на фарміраванне граматычнага ладу маўлення.

*а) комплексныя заняткі;*

*б) тэматычныя заняткі.*

**8. Што з пералічанага ў правым слупку адносіцца да метадаў, а што да прыёмаў фарміравання граматычных паняццяў:**

| | |
|---|---|
| 1) **метады** фарміравання граматычных паняццяў | *а)дыдактычныя гульні, гульні-драматызацыі* |
| 2) **прыёмы** фарміравання граматычных паняццяў | *б)узор, тлумачэнне* |
| | *в) указанне, параўнанне, паўтарэнне* |
| | *г) разглядванне карцін, пераказ кароткіх апавяданняў і казак* |
| | *д) слоўныя практыкаванні* |

**9. Размяркуйце памылкі па групах:**

| 1) Марфалагічныя памылкі | 2) Сінтаксічныя памылкі |
|---|---|

а) Вось яшчэ лопнуў шар у дзядзькі, таму націснуў моцна;

б) лялькав, дзяўчынкав; каля носе;

в) плакаю, маляваю, можу;

г) Я надзела цёплую футра, чаму што на вуліцы холадна;

д) Як мы прыйшлі дадому, мы гулялі з мячом;

е) вялікае яблык, тата найшла, цёплая малако.

**10. Праблемная сітуацыя.** *Выхавальнік заўважыў памылку ў маўленні дзіцяці. Што ён будзе рабіць?*

а) нічога;

б) зробіць заўвагу, паўторыць памылку, скажа, што так гаварыць нельга;

в) зверне ўвагу дзяцей на памылку, прапануе выправіць яе.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

РАЗДЗЕЛ 2

# МЕТОДЫКА ВЫХАВАННЯ ГУКАВОЙ КУЛЬТУРЫ МАЎЛЕННЯ

Лекцыя 1

## Паняцце пра гукавую культуру маўлення. Задачы выхавання культуры маўлення дашкольнікаў

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*1.1. Паняцце пра гукавую культуру маўлення.*

*1.2. Задачы выхавання гукавой культуры маўлення ў дашкольнікаў.*

*1.3. Асаблівасці засваення дзецьмі гукавой культуры маўлення.*

*1.4. Праверка маўлення дзяцей.*

### 1.1. Паняцце пра гукавую культуру маўлення

**Культура маўлення** – гэта ўменне правільна карыстацца моўнымі сродкамі для выказвання сваіх думак.

Паняцце **гукавой культуры маўлення** ўключае ў сябе наступныя кампаненты: ***інтанацыю, правільную артыкуляцыю гукаў, фанетычную і арфаэпічную правільнасць маўлення, моўнае дыханне, фанематычны слых.***

***Інтанацыя*** – гэта складаны комплекс спосабаў эмацыянальнай выразнасці, пры дапамозе якога мы можам перадаць сум, радасць, незадаволенасць і г.д. Да спосабаў інтанацыйнай выразнасці належаць: *мелодыка, тэмп, рытм, тэмбр, лагічны націск.*

*Мелодыка* – гэта павышэнне або паніжэнне голасу для выказвання пытання, сцвярджэння, усклікання.

*Тэмп* – хуткасць працякання моўнага патоку ў часе. Тэмп бывае паскораным, сярэднім, запаволеным. Для дзяцей характэрны хуткі тэмп, што зніжае выразнасць і зразумеласць маўлення. Неабходна прывучаць дзяцей да сярэдняга тэмпу маўлення.

*Рытм* – раўнамернае чаргаванне націскных і ненаціскных складоў. Характэрны для паэтычнага маўлення.

*Тэмбр* – гэта афарбоўка голасу. Голас можа быць звонкі, глухі, гугнявы і інш. У дзяцей галасы пераважна ціхія, сіплыя, глухія, басістыя. Маўленне ў іх манатоннае. Парушэнне голасу можа наступіць з прычыны захворвання верхніх дыхальных шляхоў, а таксама пры пастаянным



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

перанапружанні голасу крыкам, асабліва ў халодны перыяд года. Тэмбр таксама залежыць ад вышыні і сілы голасу, г. зн. павышэння і паніжэння тону ў працэсе гаварэння, што забяспечвае выразнасць маўлення.

*Лагічны націск* – сэнсавае вылучэнне слова ў фразе шляхам павышэння або паніжэння, узмацнення голасу ў спалучэнні з павелічэннем працягласці вымаўлення.

***Фанетычная правільнасць*** залежыць ад правільнай артыкуляцыі і дыкцыі. Выхавальнік павінен ведаць асаблівасці вымаўлення гукаў роднай мовы, артыкуляцыю гукаў. Дзіця добра дыферынцыруе гукі, адрознівае іх на слых, але не заўсёды правільна іх вымаўляе. Таму неабходна практыкаваць моўныя органы дзяцей у выразнай дыкцыі.

*Дыкцыя* – гэта зразумелае і дакладнае вымаўленне слоў і іх спалучэнняў. З дапамогай спецыяльных практыкаванняў неабходна развіваць рухавасць языка, вуснаў, уменне ўтрымліваць ніжнюю сківіцу ў патрэбным становішчы.

***Арфаэпічная правільнасць маўлення*** – гэта прытрымліванне нормаў і правілаў літаратурнага вымаўлення. Задача выхавальніка – навучыць дзіця спачатку правільна вымаўляць кожны гук ізалявана (асобна), а потым у спалучэнні з іншымі гукамі, у словах.

***Моўнае дыханне***. Дыханне бывае *моўнае* і *нямоўнае*. Падчас нямоўнага (аўтаматычнага) дыхання ўдых чалавека па працягласці роўны выдыху. Моўнае дыханне мае сваю спецыфіку: удых кароткі, а выдых доўгі, паколькі выказванне вымаўляецца на выдыху. У дашкольнікаў слабыя дыхальныя мышцы, малы аб'ём лёгкіх. Таму дыханне ў іх неглыбокае, удых перарывісты, шумны, з рэзкім падыманнем плячэй. Дзіця ўдыхае перад кожным словам і нават пасярэдзіне, глытае канчаткі слоў. Таму неабходна вучыць дзяцей правільнаму моўнаму дыханню.

Абавязковай умовай для нармальнага развіцця і правільнага вымаўлення гукаў з'яўляецца добра развіты *фізічны слых*. Нават нязначнае яго зніжэнне можа прывесці да скажонага ўспрымання ўсяго навокал і невыразнага вымаўлення гукаў.

У авалоданні гукавой культурай маўлення важнае месца належыць *маўленчаму слыху*. Яго кампанентамі з'яўляюцца ўспрыманне тэмпу, рытму маўлення, успрыманне павышэння і паніжэння голасу.

***Фанематычны слых*** – гэта ўменне адрозніваць гукі, дзякуючы чаму пазнаюцца словы, дзіця разумее мову.

Вядучую ролю ў развіцці маўленчага і фанематычнага слыху адыгрывае слыхавы аналізатар. Таму неабходна берагчы органы слыху дзя-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цей ад пашкоджаняў, ад шуму, крыку. Калі навокал размаўляюць гучна, дзіцяці хутка стамляецца, калі вельмі ціха – у дзіцяці прытупляецца слых, бо адбываецца напружванне слыхавога органа.

Такім чынам, выхаванне гукавой культуры маўлення праводзіцца ў двух накірунках: 1) развіццё слыхавой увагі і маўленчага слыху; 2) развіццё моварухальнага апарату і гукавога афармлення маўлення.

## 1.2. Задачы выхавання гукавой культуры маўлення ў дашкольнікаў

У адпаведнасці з асноўнымі аспектамі паняцця “гукавая культура” можна вылучыць наступныя задачы:

- развіццё маўленчага і фанематычнага слыху;
- развіццё слыхавой увагі;
- фарміраванне правільнага вымаўлення гукаў;
- навучанне дакладнаму вымаўленню слоў у адпаведнасці з моўнымі правіламі;
- развіццё інтанацыйнай выразнасці маўлення: умеранага тэмпу, умеранай гучнасці, правільнага моўнага дыхання.

## 1.3. Асаблівасці засваення дзецьмі гукавой культуры маўлення

Працэс засваення гукавой сістэмы маўлення ўключае *развіццё фанематычнага слыху і авалоданне правільным вымаўленнем гукаў*.

Развіццё слыхавога ўспрымання і маўленчага слыху апярэджвае вымаўленчыя магчымасці дзяцей. Ужо ў першыя месяцы жыцця ў дзіцяці развіваецца здольнасць адрозніваць па голасе блізкіх людзей, успрымаць на слых змяненне голасу па вышыні і сіле, адчуваць эмацыянальную афарбоўку маўлення. На пятым месяцы жыцця дзеці распазнаюць тон голасу, на восьмым – інтанацыю (пытальную, ласкавую, патрабавальную). Як паказваюць даследаванні, да 1 года 7 месяцаў фанематычны слых у дзяцей аказваецца сфарміраваным.

Авалоданне фанетычным складам маўлення пачынаецца ў канцы першага года жыцця.

***У малодшым дашкольным узросце*** многія гукі дзеці не вымаўляюць зусім або вымаўляюць няправільна, замяняюць іх іншымі гукамі *(ак – рак, зюк – жук),* сустракаюцца парушэнні ў складовай структуры слова *(басяка – сабака, чаўрак – чарвяк).* Артыкуляцыйныя рухі цяжкаватыя, маўленчае дыханне перарывістае, голас ціхі (у некаторых дзяцей

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

крыклівы), тэмп маўлення – паскораны. Слыхавая ўвага і маўленчы слых развіты недастаткова, маўленне малавыразнае, характарызуецца змякчонасцю (*ліжачка – лыжачка, руцька – ручка*).

***На 4–5 годзе жыцця ў дзяцей*** памяншаецца колькасць гукаў, якія яны вымаўляюць няправільна, знікае змякчэнне гукаў, рэдка сустракаюцца парушэнні ў складовай структуры слова. У дзяцей з'яўляецца правільнае, хаця і няўстойлівае вымаўленне *шыпячых гукаў* і гука *р*. Некаторыя дзеці яшчэ не заўсёды могуць рэгуляваць дыханне, голас, тэмп маўлення, не заўсёды правільна ставяць націск у словах, інтанацыйная выразнасць недасканалая.

**Да шасцігадовага ўзросту** дзеці павінны ўмець правільна вымаўляць усе гукі роднай мовы. Дзеці могуць на адным выдыху вымавіць доўгія фразы, але рэгуляваць тэмп маўлення, гучнасць голасу ўмеюць не ўсе. Як паказваюць дадзеныя, у многіх дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту (40%) назіраюцца недахопы ў маўленні шыпячых, свісцячых, санорных гукаў. Гэта звязана з узросшай нервовай напружанасцю дзяцей, эмацыянальным дыскамфортам, дэфіцытам асобасных зносін.

Дзеці здольны заўважыць памылкі ў няправільным вымаўленні гукаў, але яны не могуць вылучыць і назваць няправільна вымаўлены гук асобна, а выпраўляюць усё слова цалкам (*Не скола, а школа*).

Недахопы ў маўленні дзяцей можна прадухіліць ці пераадолець пры двух умовах: 1) мова выхавальніка павінна быць прыкладам для дзяцей (правільнай, чыстай, дасканалай); 2) неабходна пастаянна практыкаваць дзяцей у правільным вымаўленні гукаў, іх спалучэнняў, сказаў.

Трэба ахоўваць нервовую сістэму і слых дзяцей, не дапускаць шуму ў групе, гучных размоў, крыку, прывучаць дзяцей размаўляць спакойным тонам.

### 1.4. Праверка маўлення дзяцей

Каб правільна спланаваць работу з групай і асобнымі дзецьмі, выхавальніку неабходна ведаць асаблівасці маўлення кожнага дзіцяці. Таму напачатку года ў кожнай узроставай групе выхавальнікі, часам разам з лагапедамі, правяраюць стан гукавымаўлення дзяцей. Вынікі запісваюць у спецыяльны сшытак. Вясной праводзіцца паўторная праверка маўлення выхаванцаў для падвядзення вынікаў работы за год.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Каб выявіць прычыны магчымых недахопаў гукавымаўлення і намеціць шляхі іх выпраўлення, трэба загадзя пазнаёміцца з агульным станам здароўя дзяцей, развіццём іх моўнага і слыхавога апарату.

Перш за ўсё выхавальнік высвятляе асаблівасці маўлення дзяцей, прыслухоўваючыся да дзіцячых размоў, праводзячы гутаркі з імі. Старэйшым дзецям можна прапанаваць прачытаць на памяць знаёмы верш, расказаць казку, сюжэт мультфільма і г. д. Недахопы адразу кідаюцца ў вочы: заіканне, косназыкасць і інш.

З мэтай больш дакладнага выяўлення асаблівасцей маўлення дзяцей неабходна індывідуальна падысці да кожнага дзіцяці. З гэтай мэтай прапануецца праводзіць гутаркі, гульні з выкарыстаннем малюнкаў з выявамі знаёмых дзецям прадметаў, цацак. Абследаванне праводзіцца так, каб дзіця гэтага не заўважыла. Рэкамендуецца выкарыстоўваць як мага больш гульнявых прыёмаў.

Вынікі абследавання заносяцца ў спецыяльную табліцу, складзеную для ўсёй групы, або асабовую карту дзіцяці. Гэта дае магчымасць прасачыць дынаміку засваення гукавымаўлення дзіцём на працягу знаходжання ў дзіцячым садзе.

| № п/п | Прозвішча, імя дзіцяці | Час абследавання | Узрост | Шыпячыя | | | Санорныя | | Свісцячыя | | | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | *ж* | *ш* | *ч* | *л* | *р* | *з* | *с* | *ц* | |
| 1 | Іваноў Дзмітрый | 2.09.2020 | 3 гады 4 месяцы | + | + | ц | - | Н | + | + | с | Голас сіплы, маўленне невыразнае |

"+" – гук ва ўсіх пазіцыях вымаўляе правільна

"–" – не вымаўляе гук

"Н" – няўстойлівае вымаўленне (не заўсёды вымаўляе правільна: *чапля,* але *хлопцык*)

"ц" – скажае гук, замяняе яго іншым (указваецца, якім гукам замяняе).

## Лекцыя 2
## Фарміраванне гукавой культуры маўлення дашкольнікаў

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*2.1. Метады фарміравання гукавой культуры маўлення.*

*2.2. Прыёмы фарміравання гукавой культуры маўлення.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

**2.1. Метады фарміравання гукавой культуры маўлення**

***Гульні:***

- ***дыдактычныя гульні*** (гульня на фарміраванне маўленчага дыхання – "Матылькі", на развіццё слыхавога ўспрымання – "Адгадай, на чым іграюць");
- ***рухавыя*** ("Сава, пчолы і жукі"), ***карагодныя*** ("Каравай"), ***народныя гульні з тэкстам*** ("Гусі").

***Практыкаванні*** – з іх дапамогай адпрацоўваюцца пэўныя ўменні і навыкі: *маўленчае дыханне* ("Пагрэем ручкі"), *артыкуляцыйныя рухі* ("Зліжам смачнае варэнне"), *гукавымаўленне* (прагаворванне скорагаворак, чыстагаворак).

**2.2. Прыёмы фарміравання гукавой культуры маўлення**

***Узор*** – паказ правільнага выканання задання (дыхальнага практыкавання, гукавымаўлення і інш.).

***Тлумачэнне*** – калі выхавальнік не проста паказвае, але яшчэ дзеянні суправаджае тлумачэннем *(Каб так доўга працягнуць гук, удыхніце як мага больш паветра і павольна яго выдыхайце).*

Узор і тлумачэнне могуць спалучацца з ***паказам артыкуляцыйных рухаў*** *(Каб праспяваць песенку паравозіка (у-у-у), трэба губы выцягнуць трубачкай).*

***Вымаўленне слова з інтанацыйным падкрэсліваннем гука, націску*** (*Гэта кошшка, а ў дзяўчынкі косска*).

***Паўтарэнне*** гукаў, гукаперайманняў, слоў – дзеці паўтараюць ўслед за выхавальнікам гукі, гукаперайманне ці словы. Паўтарэнне можа быць *харавое* і *індывідуальнае.*

***Сумеснае вымаўленне*** дзіцяці і выхавальніка.

***Адлюстраванае вымаўленне*** – неадкладнае паўтарэнне дзіцём узору выхавальніка.

***Ацэнка*** маўлення і ***выпраўленне*** памылак .

Работа на выхавані гукавой культуры маўлення ў дзіцячым садзе ажыццяўляецца:

- на спецыяльных занятках (занятках па развіцці маўлення);
- уключаецца ў іншыя заняткі;
- праводзіцца па-за заняткамі (з дзецьмі, якія маюць патрэбу ў дадатковых практыкаваннях).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# МЕТОДЫКА РАБОТЫ НАД КАМПАНЕНТАМІ ГУКАВОЙ КУЛЬТУРЫ

Лекцыя 3

## Методыка развіцця слыхавога ўспрымання і фанематычнага слыху ў дзяцей дашкольнага ўзросту

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*3.1. Паняцце пра слыхавое ўспрыманне, слыхавую ўвагу, слыхавую памяць. Асноўныя этапы іх фарміравання.*

*3.2. Паняцце пра фанематычны слых і фанематычнае ўспрыманне. Этапы фарміравання фанематычнага ўспрымання ў дзяцей дашкольнага ўзросту.*

*3.3. Развіццё слыхавога ўспрымання і фанематычнага слыху ў дзяцей розных узроставых груп.*

### 3.1. Паняцце пра слыхавое ўспрыманне, слыхавую ўвагу, слыхавую памяць. Асноўныя этапы іх фарміравання

Ад самага нараджэння чалавека акружае мноства гукаў: шапаценне лістоты на дрэвах, шум дажджу, спеў і шчабятанне птушак, браханне сабак, сігналы машын, музыка, маўленне людзей і г.д. Усе гэтыя гукі ўспрымаюцца дзіцём неўсвядомлена, зліваючыся з іншымі, больш важнымі для іх гукамі. Маленькае дзіця не ўмее адрозніваць гэтыя гукі, часам нават не заўважае іх, не можа параўнаць іх па гучнасці, тэмбры.

***Слыхавое ўспрыманне*** – гэта здольнасць не проста чуць, а прыслухоўвацца, засяроджваць сваю ўвагу на гуку, моцнасці яго гучання, на тэмбры.

Слыхавое ўспрыманне – вельмі важная асаблівасць, уласцівая толькі чалавеку. Без яго нельга навучыцца чуць і разумець маўленне іншых, а значыць, і размаўляць.

Слыхавое ўспрыманне пачынаецца са ***слыхавой увагі*** – уменне засяроджвацца на гуку, вызначаць яго і суадносіць з прадметам, які гэты гук утварае. Усе гукі, якія чалавек успрымае і аналізуе, а затым узнаўляе іх, ён запамінае, дзякуючы ***слыхавой памяці.***

Для таго каб дзіцяці навучылася правільна і дакладна размаўляць, добра арыентавацца ў прасторы, слыхавое ўспрыманне, слыхавую ўвагу і памяць трэба мэтанакіравана развіваць з самага дзяцінства. Як вядома, дзеці любяць гуляць, таму лепш за ўсё рабіць гэта ў гульнёвай форме паэтапна і ў пэўнай паслядоўнасці.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Пачынаць неабходна з гульняў, якія дапамагаюць падрыхтаваць органы слыху дзіцяці да ўспрымання правільнага гуку і правільнай артыкуляцыі, неабходных для правільнага ўзнаўлення гука. На першым меццы стаяць гульні па развіцці слыху. Але слых бывае розны: *біялагічны* і *маўленчы*.

***Маўленчы слых*** – паняцце шырокае. Яно ўключае ў сябе здольнасць да слыхавой ўвагі і разумення слоў, уменне ўспрымаць і адрозніваць розныя якасці маўлення: тэмбр ("Даведайся па голасе, хто цябе паклікаў?"), выразнасць ("Паслухай і адгадай: спалохаўся або ўзрадаваўся мішка?").

Падбор гульняў павінен ісці ў пэўнай паслядоўнасці: спачатку для развіцця слыхавой увагі, г. зн. умення адрозніваць немаўленчыя гукі па іх гукачастотных уласцівасцях – **1 этап** *(Гульні "Дзе пазванілі?", "Хованкі са званочкам", "Адкажы, што гучыць" і інш).* Затым для развіцця маўленчага слыху, г. зн. умення дзіцяці адрозніваць розныя галасы людзей, разумець сэнс фразы таго, хто гаворыць – **2 этап** *(Гульні "Адгадай, чый галасок", "Запомні словы").* І толькі пасля гэтага неабходна пераходзіць да развіцця фанематычнага слыху, г. зн. умення чуць састаўныя часткі слова (гукі, фанемы) – **3 этап.**

### 3.2. Паняцце пра фанематычны слых і фанематычнае ўспрыманне. Этапы фарміравання фанематычнага ўспрымання ў дзяцей дашкольнага ўзросту

Развіты маўленчы слых ўключае ў сябе і добры ***фанематычны слых***, г. зн. уменне дыферэнцыраваць усе гукі (фанемы) роднай мовы – адрозніваць сэнс слоў, блізкіх па гучанні *(дом – дым, сок – сук; лыжка – шышка).*

Фарміраванне фанематычнага слыху завяршаецца прыблізна да двух з паловай гадоў. Ён з'яўляецца асновай для разумення сэнсу таго, што кажуць, бо, замяніўшы нават адзін гук у слове, мы атрымаем зусім іншае слова *(каза – каса, дом – том).* Калі дзіцяці прапускае гукі, няправільна вымаўляе іх, замяняе адзін гук другім, г. зн. у яго не да канца сфарміраваны фанематычны слых. Калі над гэтым не працаваць, то ў школе дзіця будзе дапушчаць памылкі ў напісанні слоў.

***Фанематычнае ўспрыманне*** – гэта здольнасць адрозніваць фанемы роднай мовы і вызначаць гукавы склад слова. Напрыклад: *"Колькі складоў у слове МАК? Колькі гукаў у гэтым слове? Які зычны стаіць на канцы слова? Які галосны гук у сярэдзіне слова?".* Фанематычнае ўспрыманне фарміруецца ў перыяд ад 1 да 4,5–5 год.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

У рабоце па фарміраванні фанематычнага ўспрымання можна вылучыць наступныя этапы:

**І этап – распазнаванне немаўленчых гукаў.** На дадзеным этапе ў працэсе спецыяльных гульняў і практыкаванняў дзеці развіваюць здольнасць распазнаваць і адрозніваць немаўленчыя гукі. Можна прапанаваць паслухаць гукі за акном: што шуміць? (дрэвы), што гудзіць? (машына), хто брэша? (сабака). Затым можна прапанаваць паслухаць гукі, якія чуваць у групе, на карыдоры, даносяцца з суседняй групы і г.д.

**ІІ этап – адрозненне вышыні, сілы, тэмбру голасу на матэрыяле аднолькавых гукаў, слоў, фраз.** Напрыклад, гульня "Далёка-блізка" (Дзеці па чарзе называюць імя вядучага, які стаіць да іх спіной. Вядучы на слых павінен вызначыць і паказаць, хто яго паклікаў. Гульню можна ўскладніць, гаворачы замест імя слова "Агу", потым гэта слова гаворыцца то ціха, то громка).

**ІІІ этап – адрозненне слоў, блізкіх па сваім гукавым складзе.** Напрыклад, можна правесці гульні "Прыдумай слова" (дзецям прапаноўваюць паслухаць слова і прыдумаць словы, якія гучаць падобна (*мышка – міска*, *мішка*, *шышка*, *фішка*; *каза – каса*, *аса*, *ліса* і г.д.); "Лішняе слова" (педагог вымаўляе словы і прапануе дзіцяці знайсці лішняе, якое адрозніваецца ад астатніх: *ком*, *ком*, *кот*, *ком*; *вінт*, *вінт*, *вінт*, *бінт*).

**IV этап – дыферэнцыяцыя складоў.** На дадзеным этапе дзеці аказваюцца падрыхтаваны да таго, каб вучыцца адрозніваць склады. Гульня "Тэлефон" (Дзеці сядзяць адзін каля аднаго. Педагог называе склад ці некалькі складоў (*су-су-со*; *па-па-са* і інш.), на вушка першаму дзіцяці. Дзеці перадаюць адзін аднаму пачутае па ланцужку. Апошняе дзіця называе ўслых. Паслядоўнасць ланцужка змяняецца).

**V этап – дыферэнцыяцыя фанем.** Дзеці вучацца адрозніваць фанемы роднай мовы, прычым пачынаць абавязкова патрэбна з галосных гукаў. Напрыклад, гульні "Выберы правільна" (Сярод 5–6 малюнкаў дзіця знаходзіць тыя, у якіх ёсць зададзены гук), "Знайдзі аднолькавы гук" (Выхавальнік вымаўляе некалькі слоў, а дзеці вызначаюць, які гук у іх паўтараецца: *сава, косы, нос* – гук *с*).

**VI этап** – задачай апошняга этапу з'яўляецца **развіццё ў дзяцей навыкаў элементарнага гукавога аналізу.** Гэта работа пачынаецца з навучання дзяцей вызначаць колькасць складоў у слове, уменне паказаць воплескамі двух- і трохскладовыя словы. Выконваючы практыкаванні, вучацца знаходзіць і называць галосныя і зычныя гукі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Можна правесці гульні: "Праспявай галосны" (праспяваць працягла галосны гук – *кооот*),"Сіні – зялёны – чырвоны" (педагог называе гук, а дзіцяці паказвае, якой фішкай яго абазначыць); "Назаві па парадку" (Поўны гукавы аналіз слова: *рак – р, а, к*).

### 3.3. Развіццё слыхавога ўспрымання і фанематычнага слыху ў дзяцей розных узроставых груп

Работа па развіцці слыхавога ўспрымання заключаецца ў тым, каб з дапамогай гульнявых практыкаванняў навучыць дзяцей прыслухоўвацца да розных гукаў, вылучаць сярод разнастайных гукаў патрэбныя, навучыць пераключаць увагу з аднаго гучальнага прадмета на іншы, устанаўліваць месцазнаходжанне крыніцы гука, вызначаць, якому прадмету ён належыць.

Для развіцця слыхавой увагі ў дзяцей ***малодшага дашкольнага ўзросту*** педагогі выкарыстоўваюць як маўленчыя, так і немаўленчыя гукі. Дзецям прапануецца вызначыць, якія прадметы гучаць ("Пазнай прадмет па гуку"); вызначыць месца, адкуль зыходзіць гук ("Дзе стукалі?"); вызначыць гучнасць гука і ў залежнасці ад гэтага выканаць розныя дзеянні, напрыклад прысесці ці падскочыць. Слыхавая ўвага фарміруецца пры дапамозе гукапераймання. Дзеці вызначаюць жывёлу па голасе ("Хто крычыць?"), вызначаюць прадмет у залежнасці ад гучнасці вымаўлення гукапераймальных слоў (Што стукае: малаток ці малаточак?). Выкарыстоўваюць гульні і практыкаванні, у якіх дзеці адрозніваюць словы, блізкія па гучанні (Педагог выразна вымаўляе словы, якія адрозніваюцца адным гукам, а дзеці паўтараюць пачутае: *сок – сук, лыжка – шышка*).

***У сярэднім дашкольным узросце*** шырэй выкарыстоўваюцца гульні, якія садзейнічаюць фарміраванню розных кампанентаў маўленчага слыху, непасрэдна звязаных з развіццём голасу і гукавымаўлення (*Дзеці, давайце паслухаем, што гаворыць вуліца. Што ты чуеш? – сігналы аўтамабіляў, спевы птушак, стук* і г. д.).

З мэтай развіцця гукавысотнага слыху праводзяцца практыкаванні, у якіх ужываюцца музычныя інструменты ("На чым грае Паўлінка?"). Пры выкананні практыкаванняў "Пазнай, чый голас", "Хто паклікаў?" дзеці вучацца ўспрымаць і адрозніваць тэмбр, сілу і вышыню голасу.

Шырока выкарыстоўваюцца гульнявыя практыкаванні, у якіх ужываюцца гукапераймальныя словы. Напрыклад, падчас выканання такіх практыкаванняў, як "Адгадай, хто прыйшоў", "Чый гэта голас?" дзеці



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

па вышыні, па гучнасці голасу вызначаюць, вялікая ці маленькая жывёла падае голас, блізка ці далёка яна знаходзіцца.

З дапамогай розных практыкаванняў ажыццяўляецца развіццё фанематычнага слыху. Так, пры выкананні практыкавання “Слухай уважліва” фарміруецца ўменне вылучыць гук, які часта паўтараецца ў групе слоў (“Лежабока рыжы кот адляжаў сабе жывот”). Спачатку дзецям робіцца палёгка ў выкананні задання інтанацыйным падкрэсліваннем патрэбнага гука. Потым можна даваць больш складаныя практыкаванні (напрыклад, “Хто лепш слухае?”) пры якім педагог называе шэраг слоў, а дзеці падымаюць руку толькі тады, калі пачуюць у слове зададзены гук.

***У старэйшым дашкольным узросце*** для развіцця слыхавой увагі і фанематычнага слыху выкарыстоўваюцца тыя ж гульні, але ў больш складаным варыянце (*Дзеці падбіраюць словы, што пачынаюцца з гукаў, якімі заканчваюцца зададзеныя выхавальнікам словы* і г.д.).

Разам з тым педагог фарміруе ў сваіх выхаванцаў уменне параўноўваць іх маўленне з маўленнем іншых дзяцей, знаходзіць у ім памылкі (няправільнае вымаўленне гукаў, слоў, няправільная пастаноўка націску і інш.).

Развіццю слыхавой ўвагі і маўленчага слыху садзейнічае аналіз (ацэнка) пераказаў дзецьмі мастацкіх твораў, чытанне вершаў на памяць з указаннем, як трэба перадаваць змест верша: гучна ці ціха і г.д.)

На занятках неабходна вучыць дзяцей адрозніваць на слых розныя віды інтанацыі: просьбу, пытанне, каманду, апавяданне і інш. Вызначаючы на слых віды інтанацыі, дзеці лепш і дакладней успрымаюць змест твора, што дапамагае ім у далейшым паспяхова змяняць тон, сілу, тэмбр свайго голасу пры чытанні вершаў на памяць, пераказах і драматызацыях мастацкіх твораў.

Таксама развіццю маўленчага слыху садзейнічае выразнае чытанне выхавальнікам мастацкіх твораў, праслухоўванне аўдыязапісаў казак і вершаў, прачытаных майстрамі мастацкага слова. Дзеці, пачуўшы інтанацыйна выразнае маўленне, самі імкнуцца пры пераказе і драматызацыях пераймаць галасы герояў.

Такім чынам, добра развіты маўленчы слых забяспечвае дакладнае, яснае і правільнае вымаўленне ўсіх гукаў роднай мовы, дае магчымасць правільна рэгуляваць гучнасць вымаўлення слоў, гаварыць умераным тэмпам, інтанацыйна выразна.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Лекцыя 4

## Навучанне правільнаму вымаўленню спецыфічна беларускіх гукаў. Работа па засваенні беларускай арфаэпіі

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*4.1. Навучанне правільнаму вымаўленню спецыфічна беларускіх гукаў.*

*4.2. Работа над беларускай арфаэпіяй.*

### 4.1. Навучанне правільнаму вымаўленню спецыфічна беларускіх гукаў

У сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя асаблівую ўвагу трэба надаваць навучанню рускамоўных выхаванцаў правільнаму вымаўленню спецыфічна беларускіх гукаў.

У залежнасці ад ступені падабенства з фанемамі рускай мовы **фанемы беларускай мовы можна падзяліць на тры групы:**

***I група*** – фанемы, якія супадаюць у беларускай і рускай мовах. Гэта ўсе галосныя і пераважная большасць зычных фанем: [м], [м’]; [б], [б’]; [в], [в’]; [ж], [ш] і інш.

***II група*** – фанемы, якія адрозніваюцца паміж сабой у рускай і беларускай мовах тымі ці іншымі акустыка-артыкуляцыйнымі характарыстыкамі (напрыклад, цвёрдасцю-мяккасцю): [ч’] – [ч], [г], [г’] выбухныя – [г], [г’] фрыкатыўныя, [д’] – [дз’], [т’] – [ц’], [р’] – [р] (*чёрный – чорны, гриб – грыб, гимн – гімн, дети – дзеці, река – рака).*

***III група*** – гэта фанемы, аналагаў якіх няма ў рускай мове. Такіх фанем у беларускай мове дзве – [дж], [ў]. Аднак гэтыя фанемы маюць эквіваленты ў рускай мове – [ ж] ( урожай – ураджай) і [в], [ф], [л] (правда – праўда, травка – траўка, волк – воўк ). У сваю чаргу, у рускай мове існуе гук [щ’], які адсутнічае ў беларускай фанетычнай сістэме. Эквівалентам гука [щ’] выступае ў беларускай мове гукаспалучэнне [шч].

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання на занятках па беларускай мове мэтазгодна працаваць толькі над гукамі другой і трэцяй груп ( астатнія гукі адпрацоўваюцца на занятках па развіцці рускага маўлення).

**Фарміраванне правільнага вымаўлення таго ці іншага гука другой мовы ажыццяўляецца ў пэўнай паслядоўнасці:**

1. ***Этап слыхавога ўспрымання,*** які ўключае знаёмства з новым гукам у слове і абстрагаванне гука ад слова. У гульнявой сітуацыі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

трэба засяродзіць увагу дзяцей на патрэбным гуку, а затым увесці яго ізалявана.

2. ***Пастаноўка ізаляванага гука беларускай мовы*** шляхам тлумачэння і па меры магчымасці дэманстрацыі яго артыкуляцыі. Паўтарэнне дзеяння ў адпаведнасці з гульнявым момантам.

3. ***Слыхавыя практыкаванні на распазнаванне новага гука.*** Дзеці вучацца распазнаваць новыя гукі беларускай мовы, якія змешваюцца ў вымаўленні з гукамі рускай мовы або падобныя на гукі беларускай мовы.

4. ***Узнаўленне дзецьмі новага гука*** (імітацыя гукавых адрозненняў у гульні).

5. ***Самастойнае вымаўленне новага гука ў гульні.***

6. ***Уключэнне патрэбнага гука ў словы і фразы*** беларускага вуснага маўлення ў працэсе гульнявых дзеянняў.

7. ***Аўтаматызацыя правільнага вымаўлення гука*** ў беларускім маўленні.

Кожная фанетычная гульня і гульнявое практыкаванне складаюць пэўную сістэму, пабудаваную па прынцыпе ўскладнення артыкуляцыі.

### 4.2. Работа над беларускай арфаэпіяй

***Арфаэпія*** – гэта сукупнасць правіл літаратурнага вымаўлення. Арфаэпічныя нормы ахопліваюць фанетычную сістэму мовы, а таксама вымаўленне асобных слоў і груп слоў.

У малодшым і сярэднім дашкольным узросце дзеці засвойваюць арфаэпічныя нормы на прыкладзе асобных слоў і іх форм. У старэйшым узросце ўвага дзяцей прыцягваецца да ўсвядомленага засваення некаторых правіл.

**Адметнай асаблівасцю беларускага вымаўлення з'яўляецца:**

***Аканне*** – супадзенне ў вымаўленні галосных [о], [э] з галосным [а] пасля цвёрдых зычных, калі з іх змяшчаецца *націск (ногі – нага; дрэмле – драмлю).* Аканне распаўсюджваецца на ўсе ненаціскныя склады.

***Яканне*** – супадзенне галосных [о], [э] з галосным [а] пасля мяккіх зычных (*вецер – вятры, мёд – мядовы*). Яканне распаўсюджваецца толькі на першы пераднаціскны склад. У іншых складах галосны [а] можа быць толькі тады, калі ён ёсць у аднакарэнных словах (пяць – пятачок).

Прыметай сапраўднага правільнага беларускага вымаўлення з'яўляецца ***асімілятыўнае змякчэнне*** ў большасці выпадкаў парных па



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цвёрдасці-мяккасці зычных перад мяккімі зычнымі ([с’]нег, [дз’]веры, [ц’]вёрды, [з’]весці).

Характэрнай асаблівасцю беларускай арфаэпіі з’яўляецца ***наяўнасць падоўжаных зычных*** у словах пэўных тэматычных груп: у назоўніках ніякага роду (сёння, вяселле), у творным склоне назоўнікаў жаночага роду з чыстай асновай (цішшу, зеленню), у творным склоне лічэбнікаў (пяццю), у назоўніках жаночага роду (Наталля), у некаторых прыслоўях (ноччу).

Выхавальніку трэба звяртаць увагу дзяцей на асаблівасці ***вымаўлення спалучэнняў гукаў у розных пазіцыях слоў***. Напрыклад, вымаўленне спалучэння *чц* як падоўжанага зацвярдзелага *цц*: *у хустачцы [у хустаццы]* і інш.

З названымі асаблівасцямі вымаўлення беларускіх слоў дзеці спачатку знаёмяцца на прыкладзе асобных слоў, якія ўваходзяць у слоўнік адпаведных заняткаў.

Найбольш распаўсюджаным прыёмам фарміравання арфаэпічных уменняў дзяцей выступае ўзор вымаўлення выхавальніка. Матываваным з’яўляецца паўтарэнне асобных слоў у гульні “Рэха”: выхавальнік вымаўляе слова гучна, а дзеці па адным – цішэй. Такую гульню можна правесці нават з выхаванцамі малодшай групы.

Для замацавання вымаўлення слоў з ненаціскным [а] можна прапанаваць выхаванцам сярэдняга і старэйшага ўзросту такую гульню. Дзеці хорам вымаўляюць той ці іншы склад, які заканчваецца на [а], потым адзін з дзяцей па ўказанні выхавальніка хутка называе новае слова з гэтым складам: *ля-ля-ля – лясы*, *ля-ля-ля – лячыць*. Папярэдняе вымаўленне склада, які заканчваецца на [а], стварае ў выхаванцаў устаноўку на аканне ці яканне.

У сярэднім дашкольным узросце, калі дзеці пазнаёмяцца з тэрмінам “гук”, выхавальнік звяртае ўвагу на асаблівасці вымаўлення слоў з падоўжанымі зычнымі гукамі. Напрыклад, выхавальнік прапануе дзецям паўтарыць словы пеўніка з казкі “Коцік, Пеўнік і Ліса”: “*Нясе мяне Ліса па карчах, па каменні, па ўсякім зеллі...*”.

У старэйшым дашкольным узросце веды дзяцей замацоўваюцца і абагульняюцца. Так, абапіраючыся на набытае дзецьмі ўменне вылучаць націск у слове, ім можна растлумачыць, што ў беларускай мове ненаціскны галосны гук [а] вымаўляецца вельмі выразна: *зямля, цяпер.*

Педагог паведамляе, што ў некаторых беларускіх словах асобныя зычныя вымаўляюцца больш працягла, чым астатнія: *падарожжа, калоссе.* Гэтыя зычныя называюцца падоўжанымі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

З мэтай развіцця фанематычнага слыху дзяцей выхавальнік праводзіць з імі практыкаванні на распазнаванне слоў з падоўжанымі зычнымі або з выразным ненаціскным галосным [а]. Так, можна прапанаваць знайсці словы з падоўжанымі зычнымі ў вершы:

*У вароны сёння*
*Дзень нараджэння.*
*На стале ў вароны*
*Чай і варэнне.*

У работу над арфаэпічна правільным маўленнем уваходзіць і практыкаванне выхаванцаў у правільнай пастаноўцы націску ў тых словах, якія падобныя на рускія: *крапіва* (*крапива*), *зямлю* (*землю*) і г. д. Засваенне націску ў такіх словах і іх формах павінна быць у пэўнай меры асэнсаваным: *"Ты сказаў па-руску валенки, а па-беларуску трэба сказаць валёнкі"*.

Выхавальнік павінен звяртаць увагу на літаратурнае вымаўленне слоў (*трамвай*, а не *транвай*; *пінжак*, а не *спінжак* і г. д.).

Дзецям старэйшага дашкольнага ўзросту, якія вывучаюць беларускую мову як другую, можна прапанаваць гульню "Скажы пабеларуску", у працэсе якой замацоўваюцца і актывізуюцца маўленчыя навыкі дзяцей. Выхавальнік называе слова на рускай мове, а дзеці ў адказ – на беларускай. У якасці гульнявога дзеяння можна выкарыстаць перакідванне мяча. Прапануюцца толькі тыя словы на рускай мове, якія падобна гучаць на беларускай мове (*нога – нага*, *дети – дзеці*, *река – рака*, *печь – печ*, *колосья – калоссе* і г. д.). Дзеці, па сутнасці, не перакладаюць словы, а асэнсавана змяняюць артыкуляцыю, вымаўляючы іх у адпаведнасці з нормамі беларускай фанетыкі і афраэпіі. Уменне выконваць такое дзеянне можна лічыць адным з крытэрыяў авалодання беларускім вымаўленнем.

## Лекцыя 5
## Развіццё маўленчага голасу і інтанацыйнай выразнасці маўлення. Ахова дзіцячага голасу

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*5.1. Развіццё маўленчага голасу*

*5.2. Развіццё інтанацыйнай выразнасці маўлення.*

*5.3. Ахова дзіцячага голасу.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**5.1. Развіццё маўленчага голасу**

Практычна на ўсіх занятках па развіцці маўлення вядзецца работа па фарміраванні ўласцівасцей голасу дзіцяці – сілы, вышыні, тэмбру.

**Развіццё *сілы голасу* ажыццяўляецца па двух напрамках:**

– фарміраванне ўмення карыстацца голасам у залежнасці ад сітуацыі зносін: адказваць дастаткова гучна на занятках; гаварыць даволі гучна з выхавальнікам, таварышамі па групе, на вуліцы; гаварыць ціха, шэптам за сталом, у час адыходу да сну;

– фарміраванне ўмення мяняць сілу голасу з улікам зместу выказвання, калі змена сілы голасу выступае як элемент інтанацыі: павышаць і паніжаць гучнасць голасу, кантраляваць уласнае маўленне.

Работа па гэтых напрамках вядзецца паралельна. Дзецям прапануецца:

– вымаўляць ізаляваны гук гучна, умерана, ціха, з паступовым узмацненнем і аслабленнем голасу;

– вымаўляць гукаперайманні і гукаспалучэнні з рознай гучнасцю;

– вымаўляць словы гучна і ціха у гульнявых практыкаваннях і пры дагаворванні ў працэсе чытання спецыяльна падабраных тэкстаў;

– узнаўляць жарты-чыстагаворкі, прыказкі, прымаўкі, невялікія загадкі гучна, умерана, ціха;

– чытаць вершы, забаўлянкі, лічылкі з рознай гучнасцю і сілай голасу.

У фарміраванні ўмення кіраваць сваім галасавым апаратам з улікам умоў зносін галоўнае месца займаюць дыдактычныя гульні і практыкаванні.

Для дзяцей сярэдняга дашкольнага ўзросту рэкамендуюцца наступныя практыкаванні: “Гуканне”, “Завіруха”, “Скажы, як я”, “Рэха”, “Хто паклікаў?” (дзеці адной падгрупы вымаўляюць з рознай гучнасцю гукаперайманні, асобныя словы або сказы, а дзеці другой падгрупы вызначаюць, каму яны могуць належыць) і інш. Для практыкавання ў сіле голасу выкарыстоўваюцца і чыстагаворкі, невялікія фразы, якія вымаўляюцца гучна, умерана, ціха, шэптам.

Па-за заняткамі можна прапанаваць дзецям (падгрупе ці індывідуальна) выканаць наступныя гульнявыя практыкаванні.

**“Ціха, лялька спіць”.** Пакласці ляльку ў ложак і сказаць, што цяпер трэба размаўляць шэптам, каб яе не разбудзіць.

“Пара лялцы ўставаць!” – папрасіць дзіцяці разабудзіць ляльку (пры гэтым можна гаварыць “звычайным” голасам).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**“Жабы і жабаняты”.** Дарослы будзе “жабай”, дзіця – “жабанём”. Сказаць дзіцяці, што жабы квакаюць гучна: “КВА-КВА-КВА”, а маленькія жабаняты – ціха: “ква-ква-ква”. Педагог прапануе пагаварыць адзін з адным на “жабінай” мове: “КВА-КВА-КВА” – “ква-ква-ква”. Гэтаксама можна арганізаваць “дыялог” сабакі і шчаняці, кошкі і кацяняці і г.д.

Практыкаванні на фарміраванне ўмення мяняць ***вышыню голасу*** з’яўляюцца найбольш цяжкімі для дзяцей сярэдняга ўзросту. Таму ў працэсе навучання патрэбен ўзор маўлення дарослага. Так, калі педагог чытае казку або апавяданне, у змесце якога ёсць гукаперайманні, ён вымаўляе іх то нізкім, то высокім голасам (за кошку і кацяня, казу і казляня), а дзеці пераймаюць узор.

Для адпрацоўкі ўмення мяняць вышыню голасу, адрозніваць на слых змену тону выкарыстоўваюцца фальклорныя творы, апавяданні. Напрыклад, падчас драматызацыі ці інсцэніроўкі казкі “Тры мядзведзі” дзеці вымаўляюць фразы за Міхайлу Іванавіча (нізкім голасам), за Настассю Пятроўну (сярэднім па вышыні голасам) і за Мішутку (высокім голасам) і г.д.

Таксама для дзяцей прапануюцца практыкаванні, накіраваныя на фарміраванне ***ўмення карыстацца пытальнай і сцвярджальнай інтанацыяй***. Можна прапанаваць адным дзецям прыдумваць пытанні, а іншым адказваць на іх. Выкарыстоўваецца і спецыяльны маўленчы матэрыял (чыстагаворкі): “Спіць спакойна стары сом?” – “Спіць спакойна стары сом”.

Такім чынам, у развіцці галасавога апарату значную дапамогу аказваюць народныя жарты-дыялогі, інсцэніроўкі мастацкіх твораў, а таксама гульні і практыкаванні з дыялогам.

### 5.2. Развіццё інтанацыйнай выразнасці маўлення

Работа над маўленчым голасам цесна звязана з выхаваннем інтанацыйнай выразнасці маўлення, работа над якой праводзіцца як на занятках па развіцці маўлення, так і на занятках па мастацкай літаратуры, асабліва пры завучванні вершаў.

На занятках па развіцці маўлення, асабліва прысвечаных выхаванню гукавой культуры маўлення, дзецям прапануюцца спецыяльныя практыкаванні. Карыснымі з іх з’яўляюцца тыя, у якіх патрабуецца вымаўленне адных і тых жа фраз з рознымі інтанацыямі: просьбы, здзіўлення, воклічу, сцвярджэння; весела сумна, урачыста і г.д. Напрыклад: прапанаваць дзецям вымавіць сказы “Ідзе дождж”, “Зіма прыйш-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ла", "Квітнеюць сады" з інтанацыяй радасці, здзіўлення; вымавіць фразу "Жук паўзе" з інтанацыяй страху, здзіўлення, пытання.

Таксама ўжываюцца практыкаванні, накіраваныя на развіццё змены голасу: паўтарыць гукапераймання *мяў-мяў, ме-ме, гаў-гаў, іа-іа* і інш. жаласліва, сярдзіта, спалохана.

Уменне вылучаць голасам найбольш важныя па сэнсе словы развіваецца з дапамогай спецыяльных практыкаванняў. Напрыклад, дзецям прапануецца ў сказе *Вавёрка грызе арэшкі* вылучаць голасам спачатку слова "вавёрка" (сказаць так, каб было зразумела, што менавіта вавёрка грызе арэшкі, а не іншы звярок), затым слова "грызе" (а не разбівае, напрыклад, малаточкам), далей слова "арэшкі" (а не грыбы). Педагог можа выкарыстаць псеўдакамунікатыўную сітуацыю і перапытаць: "Хто-хто грызе арэшкі?" У адказ дзіця міжвольна вылучае голасам першае слова ў сказе. Падобным чынам прапануецца пагуляць з рознымі сказамі.

Фарміраванню спакойнага, нягучнага голасу, разважальнай інтанацыі садзейнічаюць такія гульнявыя пактыкаванні, як "Дыктар", "Каментатар"; выпрацоўцы ўпэўненага, гучнага голасу – "Камандзір", ветлівага абыходжання з выкарыстаннем адпаведнай інтанацыі – "Пакупнік", "Прадавец", "Добрыя суседзі" і інш.

На занятках па мастацкай літаратуры даецца ***ўзор*** выразнага чытання вершаў. У сярэднім дашкольным узросце ён з'яўляецца галоўным метадычным прыёмам навучання правільнай інтанацыі. Пры расказванні казак, апавяданняў шырока выкарыстоўваюцца ***інсцэніроўкі***. Пераўвасабленне дзяцей у любімых герояў выклікае ў іх спробы перадаць з дапамогай голасу, мімікі, жэстаў маўленне гэтых герояў, што пашырае магчымасці голасу, інтанацыйнай выразнасці маўлення дзяцей.

Важна вучыць дзяцей карыстацца інтанацыяй, якая спатрэбіцца ім у шодзённым жыцці (інтанацыі ветлівасці, добразычлівасці, прыязнасці). Таксама гэтаму спрыяюць гульні "Тэлефон", "Сустракаем гасцей" і інш.

На ўсіх занятках і ў штодзённых зносінах выхавальнік сочыць за тым, каб у час адказу, размовы дзіця звярталася да слухачоў, прымала спакойную позу, не жэстыкулявала. Культурныя паводзіны выхоўваюцца на працягу ўсяго часу знаходжання дзіцяці ў дашкольнай установе.

Такім чынам, сістэматычная работа па развіцці маўленчага голасу і інтанацыйнай выразнасці маўлення спрыяе фарміраванню камунікатыўнай кампетэнтнасці дзіцяці, значна палягчае яму зносіны,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

спрыяе паспяховаму ўзаемадзеянню з аднагодкамі і педагогамі, забяспечвае дзіцяці задавальненне яго інтэлектуальных і эмацыйных патрэбаў.

**5.3. Ахова дзіцячага голасу**

У дзіцячым садзе неабходна наладзіць работу па ахове дзіцячага голасу. Асноўныя задачы аховы дзіцячага голасу, папярэджання яго парушэнняў зводзяцца да наступнага:

1. Захаванне элементарных правілаў гігіены слыху і голасу. Нельга дазваляць дзецям занадта гучна размаўляць, крычаць, спяваць, асабліва на вуліцы ў халодную пару года. У групе і дома неабходна ствараць спакойную атмасферу: не ўключаць на павышаную гучнасць тэлевізар, радыёпрыёмнік, своечасова выпраўляць паставу дзяцей (парушэнне дыхання вядзе да парушэння голасу), лячыць захворванні вушэй, верхніх дыхальных шляхоў, насмарк.

2. Арганізацыя правільнага маўленчага рэжыму ў групе і па-за ёй; падтрыманне цішыні ў групах, арганізацыя спакойных гульняў.

3. Падбор рэпертуару дзіцячых песень адпаведна ўзросту і фізіялагічным асаблівасцям дзяцей.

## Лекцыя 6
## Фарміраванне маўленчага дыхання

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*6.1. Этапы работы па фарміраванні маўленчага дыхання.*

*6.2. Патрабаванні да правядзення дыхальных практыкаванняў і гульняў*

**6.1. Этапы работы па фарміраванні маўленчага дыхання**

Выхаванне правільнага маўленчага дыхання пачынаецца з выпрацоўкі доўгага ротавага выдыху, умення эканомна расходаваць паветра ў працэсе працяглага вымаўлення гукаў з улікам своечасовага яго дабору.

Мэта дыхальных практыкаванняў – навучыць дзяцей хутка, бясшумна рабіць удых праз нос і рот і рацыянальна, плаўна расходаваць паветра на выдыху.

Работа па выхаванні ў дзяцей умення рэгулявць і правільна карыстацца дыханнем ажыццяўляецца ў пэўнай паслядоўнасці і складаецца з трох этапаў:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

1) навучанне спакойнаму, кароткаму ўдыху і свабоднаму, плаўнаму працягламу выдыху (праводзіцца на немаўленчым матэрыяле);

2) навучанне рацыянальнаму, эканомнаму выдыху ў працэсе вымаўлення гукаў (праводзіцца пры артыкуляцыі гукаў);

3) фарміраванне правільнага маўленчага дыхання ў працэсе маўлення (маўленне на адным выдыху фраз рознай працягласці, якія змяшчаюць ад 2 да 5 слоў).

Падрыхтоўчая работа, накіраваная на развіццё маўленчага дыхання, праводзіцца часткова ў час маўленчай гімнастыкі, але ў асноўным на занятках па развіцці маўлення.

Дзецям малодшага ўзросту прапануюць у гульнявой форме такія практыкаванні: здзьмуць з рукі "сняжынкі", "пялёсткі", падзьмуць на папяровых птушак, матылькоў, падвешаных на нітцы.

Дзецям сярэдняга і старэйшага дашкольнага ўзросту, як і малодшым, таксама прапаноўваецца у гульнявой форме выканаць практыкаванні, звязаныя з развіццём працяглага і доўгага выдыху, на немаўленчым матэрыяле, напрыклад, задзьмуць у вароты лёгкія прадметы (шарыкі). Наладжваюцца спаборніцтвы: у каго далей паляціць "сняжынка", птушачка ці паветраны шарык. У гульнях з вадой дзеці з задавальненнем дзьмуць на караблікі, лёгкія цацкі (рыбкі, качкі), што знаходзяцца ў тазіку.

**6.2. Патрабаванні да правядзення дыхальных практыкаванняў і гульняў:**

- практыкаванні і гульні павінны праводзіцца ў добра праветраным памяшканні;
- практыкаванні і гульні павінны праводзіцца не раней чым праз дзве гадзіны пасля ежы;
- адзенне не павінна сціскаць шыю, грудзі і жывот дзіцяці;
- трэба сачыць, каб дзеці рабілі ўдых і выдых без напружванняў, плаўна, не падымаючы плячэй пры ўдыху і не ўцягваючы жывот пры выдыху;
- працягласць практыкаванняў: 2–3 хвіліны для малодшых дашкольнікаў, 3–5 хвілін для сярэдняга і старэйшага дашкольнага ўзросту;
- у працэсе правядзення дыхальных практыкаванняў не трэба дамагацца поўнага выдыху.

Ужо ў малодшым школьным ўзросце пачынаецца работа над навучаннем дзяцей эканомнаму выдыху. Для выпрацоўкі роўнага, падоўжанага выдыху праз рот дзецям прапануюць вымаўляць галосныя і зычныя гукі з рознай гучнасцю. (*Як спявае паравозік? – у-у-у-у;*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*як звініць камарык? – з-з-з; як раве трактар – р-р-р*). Асаблівая ўвага звяртаецца на правільнасць вымаўлення некалькіх гукаў на адным выдыху (*ааагууу – гуканне ў лесе, iiiiaaaa – песенька восліка)*. Неабходна дабівацца ад дзяцей аднолькавай працягласці і гучнасці вымаўлення ўсіх гукаў, плаўнага пераходу ад аднаго гука да другога без дабору паветра.

Пры правядзенні гульняў і практыкаванняў неабходна звяртаць увагу дзяцей на працягласці выдыху, на раўнамернасці і плаўнасці вымаўлення гукаў, падключаючы для гэтага і слыхавы кантроль.

Неабходна, каб дзеці малодшага дашкольнага ўзросту пры выдыху маглі вымавіць фразу з 2-3 слоў, сярэдняга ўзросту – з 3-4 слоў, а старэйшага – з 3-5 слоў.

Для выпрацоўкі маўленчага дыхання дзецям можна прапаноўваць вымаўляць на адным выдыху невялікія чыстагаворкі: "*Дзе-дзе-дзе – дождж ідзе"; "Оч-оч-оч – наступіла ноч*" і інш. Гэтаксама, на адным выдыху, дзеці вучацца вымаўляць невялікія скорагаворкі. Трэба сачыць за тым, каб яны не рабілі паўз паміж асобнымі словамі. Калі дзеці вымаўляюць фразу з 6-7 і болей слоў, трэба сачыць, каб яны правільна размяркоўвалі паўзы і дабіралі паветра ў час гэтых паўзаў. Трэба дабівацца ад дзяцей злітнасці вымаўлення слоў у фразе, г. зн. выхоўваць плаўнасць маўлення.

Важную ролю ў развіцці маўленчага дыхання адыгрываюць музычныя заняткі. У час правядзення іх неабходна сачыць за правільным выдыхам, за паставай дзяцей.

Такім чынам, сістэматычная работа над развіццём маўленчага дыхання з выкарыстаннем гульнявых практыкаванняў у далейшым забяспечвае нармальнае гукаўтварэнне, ствараетумовы для падтрымкі адпаведнай гучнасці маўлення, выразнага прытрымлівання паўзаў, захавання плаўнасці маўлення і інтанацыйнай выразнасці.

Лекцыя 7

## Арганізацыя работы па выхаванні гукавой культуры маўлення

**Асноўныя лекцыйныя пытанні:**

*7.1. Навучанне правільнаму вымаўленню гукаў.*

*7.2. Асноўныя формы арганізацыі работы па выхаванні гукавой культуры маўлення*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

## 7.1. Навучанне правільнаму вымаўленню гукаў

**Гукавымаўленне** – гэта працэс утварэння гукаў мовы, які ажыццяўляецца дыхальным, голасаўтваральным, гукаўтваральным аддзеламі маўленчага апарату пры рэгуляцыі з боку нервовай сістэмы.

Навучанне гукавымаўленню ажыццяўляецца ў пэўнай паслядоўнасці:

**I этап –** ***падрыхтоўчы,*** які прадугледжвае падрыхтоўку маўленчага апарату да авалодвання гукамі мовы. Ён уключае падрыхтоўку артыкуляцыйнага апарату, яго маторыкі, маўленчага слыху, маўленчага дыхання.

Правільнае вымаўленне гукаў залежыць ад дзейнасці маўленчага апарату ў цэлым і ад дзейнасці органаў артыкуляцыі (языка, вуснаў, мяккага нёба, зубоў і г. д.), іх рухомасці і гнуткасці, каардынацыі артыкуляцыйных рухаў, іх сілы і дакладнасці. Так, цяжкі для вымаўлення гук *р* патрабуе гнуткасці рухаў языка, хуткай вібрацыі яго кончыка. Шыпячыя гукі патрабуюць моцнага струменя паветра, ўздыму языка ў форме “коўшыка”, акруглення вуснаў і выцягвання іх злёгку наперад і г. д. Таму неабходна сістэматычна практыкаваць органы артыкуляцыі, праводзіць практыкаванні, накіраваныя на трэніроўку мышц языка з мэтай надання яму патрэбнага становішча; на рухомасць вуснаў, сківіц, шчок, на выпрацоўку правільнага дыхання.

З мэтай падрыхтоўкі маўленчага апарату выкарыстоўваюцца разнастайныя практыкаванні, якія праводзяць у асноўным у гульнявой форме, што стварае ўмовы для шматразовага іх паўтарэння.

Развіццю маторыкі артыкуляцыйнага апарату служаць розныя гульні на гукаперайманне:( “Хто як крычыць?”, “Што гучыць?” і інш.); артыкуляцыйная гімнастыка: аблізванне языком верхняй і ніжняй губы (*злізванне мёду*); язык робіцца “джалам”, “шырокай лапаткай” і інш.

Для развіцця маўленчага дыхання праводзяць гульні на здзьмухванне сняжынак, “матылькоў”; паддуванне прадметаў, якія плаваюць (рыбак, караблікаў).

У працэсе дыхальных практыкаванняў дзіця вучыцца правільна дыхаць, рабіць кароткі, хуткі ўдых і доўгі, плаўны выдых. Нельга дапускаць, каб дзеці перанапружваліся і стамляліся. Практыкаванні праводзяцца седзячы, не больш за 1,5 хвіліны (пачынаючы з 0,5 хвілін).

Для развіцця маўленчага слыху, слыхавой увагі рэкамендуюцца гульні “Адгадай, хто паклікаў?”, “Адгадай, што я сказала?”, “Рэха” і інш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**II этап** – ***пастаноўка гукаў.*** Пастаноўка гукаў пачынаецца з лёгкіх па артыкуляцыі гукаў і заканчваецца больш цяжкімі *(шыпячыя, свісцячыя, р, л)*. Пры поўнай адсутнасці гука або пры яго няўстойлівым вымаўленні, што часта назіраецца ў дзяцей, бывае дастаткова фіксаваць увагу дзіцяці на гуку. Навучанне тут заснавана на перайманні дзецьмі маўлення выхавальніка, выразным вымаўленні гука выхавальнікам. Выхавальнік засяроджвае ўвагу дзяцей на гуку дзякуючы вылучэнню дадзенага гука ў слове, больш працяглаcorrectly напружанаму яго вымаўленню (*Лежабока рыжы кот адляжаў сабе жывот*).

Калі немагчыма паставіць гук на аснове пераймання, выкарыстоўваюць прыём тлумачэння з паказам артыкуляцыі патрэбнага гука і ўзору яго вымаўлення, якія суправаджаюцца практыкаваннем дзяцей у вымаўленні гука. Даступна для дзяцей тлумачыцца становішча зубоў, вуснаў і языка пры вымаўленні якога-небудзь гука. Даецца ўзор, ён паўтараецца дзецьмі індывідуальна. Спачатку тымі, хто вымаўляе яго добра, а затым тымі, у каго назіраюцца недахопы. Нарэшце гук паўтараюць усе хорам. Выхавальніку трэба прыслухоўвацца да вымаўлення дзяцей. Пры парушэннях вымаўлення педагог нагадвае артыкуляцыю гука, дае ўзор правільнага вымаўлення. Для практыкаванняў неабходна даваць дзецям новы маўленчы матэрыял, бо добра знаёмыя вершы, карцінкі выклікаюць у дзіцяці старое, звыклае вымаўленне гука.

**III этап** – ***замацаванне і аўтаматызацыя гукаў.*** На дадзеным этапе адбываецца пераход ад ізаляванага вымаўлення гука да ўключэння дадзенага гука ў спалучэнні гукаў, у словы, фразы. Дзеці вучацца вымаўляць гук у пачатку слова, у сярэдзіне, у канцы. Для замацавання і аўтаматызацыі новага гуку патрабуюцца сістэматычная трэніроўка, стварэнне такіх умоў, каб на працягу дня дзіця вымаўляла яго не менш 10-20 разоў.

У гэты перыяд карысна спалучэнне новага матэрыялу са старым. Важна весці кантроль за дзіцячым маўленнем і прапаноўваць кантрольныя практыкаванні (пераказ апавяданняў, складанне апавядання па карціне).

**IV этап** – ***этап дыферэнцыяцыі змешваемых гукаў.*** Праца над дыферэнцыяцыяй гукаў пачынаецца тады, калі дзіцяці можа правільна вымаўляць абодва змешваемых гукі у любых спалучэннях, але ў некаторых выпадках адзін гук падмяняецца іншым. Часта дзеці блытаюць шыпячыя і свісцячыя, звонкія і глухія (в–ф, з–с, ж–ш), санорныя (р–л),



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

цвёрдыя і мяккія (д–дз', т–ц', л–л'). (Замест *сушка – "шушка", замест Саша – "Шаша"*).

Дыферынцыяцыя прадугледжвае тры віды работы:

1. ***Дыферэнцыяцыя ізаляваных гукаў.*** Выхавальнік дапамагае дзецям адрозніваць гукі па іх акустычных і артыкуляцыйных характарыстыках (Дзеці параўноўваюць песенькі вялікага і маленькага званочкаў – *дон-дон* і *дзінь-дзінь*). Для дыферэнцыяцыі гука эфектыўны прыём параўнання артыкуляцыйных рухаў двух гукаў і ўстанаўленне іх адрозненняў. Пры супастаўленні двух гукаў не трэба параўноўваць правільны гук з яго скажоным варыянтам.

2. ***Навучанне ўменню адрозніваць гукі ў словах.*** Рэкамендуецца праводзіць заняткі па дыферэнцыяцыі гукаў з выкарыстаннем даступнага дзецям гульнявога матэрыялу. Так, можна падабраць карцінкі па катэгорыях: адзенне, цацкі, гародніна і г. д. У назвах прадметаў чаргуюцца змешваемыя гукі *(вішня – сліва)*. Спачатку дзецям даюць дзве карцінкі, потым колькасць малюнкаў даводзяць да трох-чатырох (кошка – сабака – свіння). Можна праводзіць практыкаванні і без малюнкаў, на адным толькі слоўнікавым матэрыяле (*нос – нож, Юра – юла*). Дзякуючы такім практыкаванням дзеці пачынаюць хутчэй і лепш заўважаць сэнсавую розніцу паміж словамі.

3. ***Дыферынцыяцыя гукаў у маўленні.*** Дзецям прапаноўваюцца для завучвання вершы, чыстагаворкі, скорагаворкі, слоўныя гульні, якія змяшчаюць тыя ці іншыя гукі, патрэбныя для дыферэнцыяцыі. Напрыклад, для замацавання дыферэнцыяцыі гукаў ***р-л*** можна прапанаваць вывучыць скорагаворку *Ловіць рыбу рыбалоў, у раку ўплыў улоў.*

На ўсіх этапах навучання гукавымаўленню рэкамендуюцца практыкаванні ў форме гульняў: з малюнкамі, цацкамі, гукаперайманнем, з элементамі рухаў, са спевамі; чытанне і завучванне вершаў, забаўлянак, пацешак, чыстагаворак. Пераказ кароткіх апавяданняў і складанне апавяданняў па малюнках пачынаецца з этапу аўтаматызацыі гука.

### 7.2. Асноўныя формы арганізацыі работы па выхаванні гукавой культуры маўлення

Выхаванне гукавой культуры маўлення дашкольнікаў ажыццяўляецца ў дзвюх формах: **навучанне на занятках; навучанне на-за заняткамі.**

Галоўная роля ў выхаванні гукавой культуры маўлення належыць заняткам.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Віды заняткаў па выхаванні гукавой культуры маўлення: *спецыяльныя, комплексныя.*

***Спецыяльныя заняткі*** поўнасцю прысвячаюцца гукавой культуры маўлення. Іх можна праводзіць адзін-два разы ў месяц з дзецьмі чацвёртага-пятага года жыцця і адзін раз у месяц з дзецьмі шостага года жыцця. Колькасць заняткаў вызначаецца ўзроўнем развіцця маўлення дзяцей. Большая частка часу на такіх занятках адводзіцца рабоце над вымаўленнем аднаго ці некалькіх гукаў, дыферэнцыяцыі гукаў (навучанне ўменню адрозніваць адзін гук ад другога). Дадзеныя заняткі спалучаюць ў сабе паказ выхавальнікам узору вымаўлення і актыўны удзел дзяцей у практыкаваннях па вымаўленні.

Акрамя гэтага, асобныя практыкаванні па выхаванні гукавой культуры маўлення ўключаюцца ў ***комплексныя заняткі*** па развіцці маўлення, якія праводзяцца кожны тыдзень. Працягласць практыкаванняў – ад 2-4 да 5-7 хвілін.Такія заняткі, акрамя работы над гукавой культурай маўлення, уключаюць у сябе работу над граматычным ладам маўлення, слоўнікавую работу, работу над звязнай мовай і інш. Напрыклад, пры пераказе казкі педагог звяртае ўвагу дзяцей на выразнасць вымаўлення слоў, на правільнае выкарыстанне інтанацыйных сродкаў.

Работа па выхаванні гукавой культуры маўлення можа ўключацца і ў змест іншых заняткаў (музычныя, заняткі гімнастыкай, рухомыя гульні).

Вядучай формай навучання з'яўляюцца калектыўныя (а не індывідуальныя) заняткі з дзецьмі. Прадуктыўнасць работы на іх значна вышэйшая, бо дзеці менш стамляюцца, калі працуюць разам.

Выхаванне гукавой культуры маўлення **па-за заняткамі** можа быць арганізавана з падгрупай дзяцей, а таксама індывідуальна. Задача педагога заключаецца ў тым, каб своечасова дапамагчы дзецям авалодаць усімі бакамі гукавой культуры маўлення. У вячэрні час з мэтай замацавання правільнага вымаўлення гукаў, фарміравання правільнага дыхання, артыкуляцыі і г. д. арганізуюцца індывідуальныя і групавыя гульні (рухомыя, харавыя, маўленчыя, дыдактычныя, гульні-інсцэніроўкі). Для адпрацоўкі дыкцыі, сілы голасу, тэмпу маўлення выкарыстоўваюцца скорагаворкі, чыстагаворкі, пацешкі, вершыкі, якія развучваюцца з дзецьмі.

Па меры таго як дзеці авалодаюць уменнем займацца ў калектыве, магчыма чаргаванне і спалучэнне харавых і індывідуальных адказаў, адказаў падгрупамі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Гульні і практыкаванні, накіраваныя на гукавымаўленне

Пры фарміраванні навыкаў вымаўлення таго ці іншага гука ў гульні важна прытрымлівацца пэўнай паслядоўнасці дзеянняў. Фанетычныя гульні будуюцца з улікам натупных этапаў работы.

1. Этап слыхавого ўспрымання, які ўключае знаёмства з новым гукам у слове і абстрагаванне гука ад слова. У гульнёвай сітуацыі трэба засяродзіць увагу дзяцей на патрэбным гуку, а затым ўвесці яго ізалявана.

2. Пастаноўка ізаляванага беларускага гука шляхам тлумачэння і па меры магчымасці дэманстрацыі яго артыкуляцыі.

3. Слыхавыя практыкаванні на распазнанне новага гука. Дзеці вучацца распазнаваць новыя беларускія гукі, якія змешваюцца ў вымаўленні з рускімі гукамі [дз']–[д], [г].

4. Імітацыя дзецьмі гукавых адрозненняў у гульні.

5. Самастойнае вымаўленне новага гука ў гульні.

Уключэнне патрэбнага гука ў словы і сказы беларускага вуснага маўлення ў працэсе гульнёвых дзеянняў.

**Дыдактычная гульня "Гусі і галубы".** Група дзяцей дзеліцца на дзве каманды: "гусей" і "галубоў". Выхавальнік – гаспадыня, якая корміць птушак. Калі яна кліча: "Гусі- гусі!", дзеці-"гусі" адказваюць: "Га-га-га!", калі кажа: "Гулі-гулі!", дзеці-галубы адказваюць: "Гу-гу-гу!". Праз некаторы час дзеці мяняюцца ролямі.

**Гульня "Рэха".** Выхавальнік вымаўляе гучна: "Ага!" Дзеці адказваюць: "Га". Выхавальнік: "Агу!" Дзеці: "Гу!". І далей: "Эге!" – "Ге!". "Ого!" – "Го!". Паўтараецца некалькі разоў.

**Гульня "Вялікі – маленькі".** Выхавальнік называе слова, якое азначае вялікі прадмет, і кідае мяч аднаму з дзяцей. Дзіця ловіць мяч і ўтварае слова, якое азначае адпаведны маленькі прадмет. Затым кідае мяч назад.

Словы для гульні: галава – галоўка, трава – траўка, карова – кароўка, канава – канаўка, певень – пеўнік, дрэва – дрэўца, сава – соўка, салавей – салоўка.

**Гульня "Жукі і пчолкі".** Адны дзеці выконваюць ролю жукоў, другія – пчолак. Адно дзіця – "сава". Выхавальнік гаворыць: "Жукі ля-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цяць, жукі гудуць". Дзеці-"жукі" вылятаюць і гудуць: "Жжжж...". Затым выхавальнік гаворыць: "Пчолкі ляцяць, пчолкі гудуць". Дзеці-"пчолкі" вылятаюць і гудуць: "Дж-дж-ж...".

"Сава" гаворыць:

Я – сава, вялікая галава,
На суку сяджу, ва ўсе бакі гляджу,
Жукоў, пчолак лаўлю!
Лячу!

На слова "лячу" дзіця-"сава" робіць узмах рукамі, як крыламі, і ловіць дзяцей. Злоўлены становіцца "савой". Праз некаторы час "жукі" і "пчолкі" мяняюцца ролямі.

**Практыкаванне "Вераб'і, рускі і беларускі".**

Сустрэліся два вераб'і, рускі і беларускі, і размаўляюць. Рускі верабей кажа: "Чик-чирик", а беларускі – "Чык-чырык". "Чик-чирик" – "Чык-чырык".

**Гульня "Качкі і лісы".** Дзеці – "качкі" рухаюцца па пакоі або пляцоўцы, размахваючы рукамі, як крыламі, і прыгаворваюць: "Мы шэранькія качкі, ляцім да вадакачкі, хочам там вады напіцца, потым каб павесяліцца. Кра-кра-кра! Кра-кра-кра!" З'яўляецца загадзя выбраная "ліса". Выхавальнік гаворыць: "З лесу ліска тут бяжыць, хоча качку злавіць. Улятайце, уцякайце!" "Ліса" крадзецца, пасля слоў "улятайце, уцякайце" ловіць качак. Каго зловіць, той становіцца "лісой".

**Гульня "На чым іграю".** Выхавальнік нагадвае дзецям, як звініць маленькі званочак ("дзінь-дзінь"), іграюць цымбалы ("дзі-лі-дзі-лі-дон"). Дзеці па аднаму ўзнаўляюць адно з гукаперайманняў, астатнія адгадваюць, на чым дзіця іграе.

## Практыкаванні для навучання рацыянальнаму, эканомнаму ўдыху, выдыху ў працэсе вымаўлення гукаў

**Гульнявыя практыкаванні**

1. Глыбокі ўдых на лік 1-2; кароткая затрымка дыхання і вымаўленне ад 2 да 4 слоў на адным выдыху (напрыклад, дні тыдня (панядзелак,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

аўторак, серада, чацвер); прадметы, якія адносяцца да пэўнай родавай групы (Адзенне: шапка, шорты, футра, куртка).

2. Глыбокі ўдых на лік 1-2; кароткая затрымка дыхання і вымаўленне чыстагаворкі з 3-4 слоў на выдыху (напрыклад, "Маша шыла шапку Сашу").

3. Глыбокі ўдых на лік 1-2; кароткая затрымка дыхання, вымаўленне чыстагаворкі з дадатковым удыхам: "Мама Мілу мылам мыла *(удых)*, Міла мыла не любіла", "Маша шыла шапку Сашу *(удых)*. Шапку Сашу шыла Маша".

Гульні "Пагрэем ручкі" (вымаўляецца на выдыху гук *х-х-х-х*), "Камары і камарык" (вымаўляецца гук *з-з-з-з* гучна і ціха), "Вялікія і маленькія жукі" (вымаўляецца гук *ж-ж-ж-ж* гучна і ціха), "Зазваніў тэлефон" (вымаўляецца гук *з-з-з*); "Раве трактар" (вымаўляецца гук *р-р-р*).

## Гульнявыя практыкаванні і дыдактычныя гульні для фарміравання маўленчага дыхання

### "Ляці, матылёк!"

*Мэта:* развіццё працяглага бесперапыннага ротавага выдыху; актывізацыя губных мышцаў.

*Абсталяванне:* 2–3 яркія папяровыя "матылькі".

*Папярэдняя работа:* перад пачаткам занятку да кожнага "матылька" прывязаць нітку даўжынёй 20–40 см, ніткі прымацаваць да вяроўкі на некаторай адлегласці адна ад адной. Затым вяроўку нацягнуць так, каб "матылькі" віселі на ўзроўні твару дзіцяці.

*Выкананне практыкавання: Педагог паказвае дзіцяці "матылькоў" і прапануе пагуляць з імі.*

– Глядзі, якія прыгожыя рознакаляровыя матылькі! Паглядзім, ці ўмеюць яны лётаць.

*Педагог дзьме на матылькоў.*

– Глядзі, паляцелі! Як жывыя! Цяпер ты паспрабуй падзьмуць. Які матылёк паляціць далей?

*Дзіця ўстае каля матылькоў і дзьме на іх.* Неабходна сачыць, каб дзіця стаяла прама, пры выдыху не ўздымала плечы, дзьмула на адным выдыху, не дабіраючы паветра, не надзімала шчокі, а вусны злёгку высоўвала наперад. Дзьмуць можна не больш за 10 секунд з паўзамі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**“Лістапад”**

*Мэта:* навучанне плаўнаму свабоднаму выдыху; актывізацыя губных мышц.

*Абсталяванне:* выразаныя з тонкай двухбаковай каляровай паперы жоўтыя, чырвоныя, аранжавыя лісточкі; вядзерца.

*<u>Выкананне практыкавання</u>: Педагог выкладвае на стале лісточкі, нагадвае дзецям пра восень.*

– Уявіце, што цяпер восень. Чырвонае, жоўтае, аранжавае лісце падае з дрэў. Падзьмуў вецер – раскідаў усё лісце па зямлі!

– Давайце зробім вецер – падзьмем на лісце!

*Дарослы разам з дзецьмі дзьме на лісце, пакуль усе лісточкі не апынуцца на падлозе. Пры гэтым неабходна сачыць за правільнасцю ажыццяўлення ротавага выдыху, а таксама за тым, каб дзеці не стамляліся.*

– Усе лісцікі на зямлі... Давайце збяром лісточкі ў вядзерца.

*Педагог і дзеці збіраюць лісточкі. Затым практыкаванне паўтараецца.*

**“Чыя птушачка далей паляціць?”**

*Мэта:* развіццё працяглага плаўнага выдыху, актывізацыя мышцаў вуснаў.

*Абсталяванне:* 2 птушачкі, зробленыя з тонкай каляровай паперы.

*<u>Выкананне практыкавання</u>:* 2 каляровыя птушачкі ставяць на край стала. Двое дзяцей становяцца насупраць птушак. Па сігнале: “Птушкі паляцелі!” дзеці дзьмуць на фігуркі (кожны на сваю). “Ляцець” птушкі могуць толькі на адным выдыху. Астатнія дзеці сочаць, чыя птушачка паляцела далей.

“Круцёлка”. *Мэта:* развіццё працяглага плаўнага выдыху; актывізацыя губных мышцаў.

*Абсталяванне:* цацка-круцёлка.

*Папярэдняя работа:* неабходна падрыхтаваць цацку-круцёлку. Можна вырабіць яе самастойна пры дапамозе паперы і драўлянай палачкі.

*<u>Выкананне практыкавання</u>: Педагог паказвае дзіцяці круцёлку; на вуліцы трэба прадэманстраваць, як яна пачынае круціцца ад подыху ветру. Затым прапануе падзьмуць на яе самастойна:*

– Давай зробім вецер – падзьмем на круцёлку. Вось як закруцілася! Пахукай яшчэ мацней – круцёлка круціцца хутчэй. Практыкаванне можа праводзіцца як індывідуальна, так і ў групе дзяцей.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## “Дзьмухаўцы”

*Мэта*: развіццё працяглага, плаўнага і моцнага выдыху.

*Выкананне практыкавання*:

Практыкаванне можна праводзіць на пляцоўцы, на дачы ці ў парку. Дзеці дзьмуць на дзьмухаўцы, каб зляцелі ўсе пушынкі.

## “Свістулькі”

*Мэта:* развіццё моцнага плаўнага выдыху; актывізацыя губных цягліц.

*Абсталяванне:* дзіцячыя керамічныя, драўляныя або пластмасавыя свістулькі ў выглядзе розных птушак і жывёл.

*Папярэдняя работа:* перад пачаткам занятку варта падрыхтаваць свістулькі. Педагог раздае дзецям свістулькі і прапануе падзьмуць у іх.

*Выкананне практыкавання*:

– Паглядзіце, якія прыгожыя ў вас цацкі-свістулькі! У Машы – птушачка, а ў Вані – алень. Давайце зробім лясны канцэрт – кожны з звяроў і птушак спявае сваю песеньку!

*Практыкаванне можна паўтарыць некалькі разоў. Педагог павінен сачыць, каб дзеці дзьмулі, не напружваючыся, не стамляючыся. Гульня можа праводзіцца як індывідуальна, так і ў групе дзяцей.*

## “Булькі”

*Мэта:* развіццё моцнага ротавага выдыху; навучанне ўменню дзьмуць праз трубачку; актывізацыя губных мышцаў.

*Абсталяванне*: шклянка з вадой, трубачкі рознага дыяметру.

*Выкананне практыкавання*: *У шклянку, напалову напоўненую вадой, педагог апускае кактэйльную трубачку і дзьме ў яе – бурбалкі з гучным булькатаннем будуць падымацца на паверхню. Затым дае трубачку дзіцяці і прапануеце падзьмуць.*

– Давай зробім вясёлыя булькі! Вазьмі трубачку і пахукай ў шклянку вады. Калі дзьмуць слаба – атрымліваюцца маленькія булькі. А калі падзьмуць моцна, то атрымліваецца цэлая бура! Давай зробім буру!

*Па “буры” ў вадзе можна лёгка ацаніць сілу выдыху і яго працягласць. У пачатку заняткаў дыяметр трубачкі павінен быць 5-6 мм, у далейшым можна выкарыстоўваць больш тонкія трубачкі. Яшчэ дзіця можа, трымаючы трубачку ў вуснах, выдыхаць паветра праз нос. У гэтым выпадку можна акуратна заціснуць нос дзіцяці пальцамі і прапанаваць падзьмуць зноў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**“Вясёлыя шарыкі”**

*Мэта:* развіццё моцнага плаўнага накіраванага выдыху; актывізацыя губных мышцаў.

*Абсталяванне:* лёгкі пластмасавы шарык.

*Выкананне практыкавання:* Дзіця сядзіць за сталом. На стале на адлегласці 20 см ад дзіцяці педагог кладзе шарык. Спачатку дарослы паказвае, як з сілай дзьмуць на шарык, каб ён рушыў на супрацьлеглы канец стала. Затым прапануе дзіцяці падзьмуць на шарык.

*Варыянт.* Можна, седзячы насупраць адзін аднаго, перакочваць адзін аднаму шарык з аднаго канца стала на другі. *Выконваючы практыкаванне ў групе, можна дазволіць спаборніцтва: двое дзяцей сядзяць за сталом, перад імі ляжаць шарыкі. Дзьмуць на шарык можна толькі адзін раз. Перамагае той, чый шарык рушыў далей.*

**“Плыві, караблік!”**

*Мэта*: развіццё моцнага плаўнага накіраванага выдыху; актывізацыя губных мышцаў.

*Абсталяванне:* папяровыя або пластмасавыя караблікі; таз з вадой.

*Выкананне практыкавання: На невысокі стол педогог ставіць таз з вадой, у якім плавае папяровы караблік. Спачатку лепш выкарыстоўваць пластмасавы караблік, бо папяровыя караблікі хутка размакаюць і тонуць. Дарослы дзьме на караблік, затым прапануе падзьмуць дзіцяці.*

– Уяві, што гэта мора. Давай пусцім у плаванне караблік. Глядзі, які моцны вецер! Як хутка паплыў наш карабель. А цяпер ты паспрабуй!

*Гульню можна ўскладніць, прапанаваўшы дзіцяці пакатацца на карабліку з аднаго горада ў іншы, пазначыўшы гарады значкамі на баках таза. У гэтым выпадку струмень паветра падчас ротавага выдыху павінен быць не толькі моцным, але і накіраваным.*

*Можна праводзіць гульню ў групе, арганізуючы спаборніцтва: чый караблік хутчэй прыплыве да мэты.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Пытанні для паўтарэння і абагульнення

1. Раскрыйце сутнасць паняцця “гукавая культура маўлення”.
2. Пералічыце асноўныя задачы выхавання гукавой культуры маўлення ў дашкольнікаў.
3. Назавіце асаблівасці засваення дзецьмі гукавой культуры маўлення.
4. Як правільна арганізаваць праверку маўлення дзяцей?
5. Пералічыце метады фарміравання гукавой культуры маўлення.
6. Якія прыёмы фарміравання гукавой культуры маўлення вам вядомы?
7. Раскрыйце сутнасць паняццяў “слыхавое ўспрыманне”, “слыхавая ўвага”, “слыхавая памяць”. Назавіце асноўныя этапы іх фарміравання.
8. Раскрыйце сутнасць паняццяў “фанематычны слых” і “фанематычнае ўспрыманне”. Пералічыце асноўныя этапы фарміравання фанематычнага ўспрымання ў дзяцей дашкольнага ўзросту.
9. У чым асаблівасці развіцця слыхавога ўспрымання і фанематычнага слыху ў дзяцей розных узроставых груп?
10. Назавіце этапы работы над спецыфічна беларускімі гукамі. Прывядзіце прыклад.
11. Назавіце асаблівасці беларускай арфаэпіі і раскрыйце методыку работы з дзецьмі ў гэтым напрамку.
12. Якую работу неабходна праводзіць з дзецьмі па развіцці маўленчага голасу?
13. Што неабходна рабіць для развіцця інтанацыйнай выразнасці маўлення.
14. Як неабходна арганізоўваць работу па ахове дзіцячага голасу?
15. Назавіце этапы работы па фарміраванні маўленчага дыхання.
16. Пералічыце асноўныя патрабаванні да правядзення дыхальных практыкаванняў і гульняў.
17. Назавіце шляхі фарміравання правільнага вымаўлення гукаў.
18. Як правільна арганізаваць работу па выхаванні гукавой культуры маўлення?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Тэставае заданне па тэме "Гукавая культура маўлення"

**1. Якія з пералічаных ніжэй кампанентаў не ўваходзяць у наняцце "гукавая культура маўлення":**

а) інтанацыя; б) марфалагічны лад; в) фанетычная правільнасць; г) моўнае дыханне; д) фанематычны слых; е) сінтаксічны лад; ж) правільная артыкуляцыя гукаў; і) словаўтварэнне; к) арфаэпічная правільнасць маўлення.

**2. Назавіце этапы навучання правільнаму вымаўленню спецыфічна беларускіх гукаў у правільнай наслядоўнасці:**

а) пастаноўка ізаляванага гука беларускай мовы; б) этап слыхавога ўспрымання; в) узнаўленне дзецьмі новага гука; г) слыхавыя практыкаванні на распазпаванне новага гука; д) уключэнне патрэбнага гука ў словы і фразы; е) аўтаматызацыя правільнага вымаўлення гука; ж) самастойнае вымаўленне новага гука ў гульні.

**3. Што з пералічанага ў правым слупку адносіцца да метадаў, а што да прыёмаў фарміравання гукавой культуры маўлення**

| | |
|---|---|
| 1) **метады** фарміравання **гукавой культуры маўлення** | *а) дыдактычныя гульні* |
| 2) **прыёмы** фарміравання **гукавой культуры маўлення** | *б) практыкаванні* |
| | *в) узор і тлумачэнне* |
| | *г) вымаўленне слова з інтанацыйным падкрэсліваннем гука, націску* |
| | *д) паўтарэнне* |
| | *е) сумеснае і адлюстраванае вымаўленне* |
| | *ж) ацэнка і выпраўленне памылак* |
| | *з) народныя гульні з тэкстам, карагодныя і рухавыя гульні* |

**4. Укажыце асноўныя формы работы па гукавой культуры маўлення:**

а) працоўная дзейнасць дзяцей; б) дыдактычныя гульні; в) заняткі па роднай мове; г) дадатковая работа па гукавой культуры па-за заняткамі; д) спецыяльныя практыкаванні; е) чытанне мастацкіх твораў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**6. Рэалізацыі якой задачы гукавой культуры маўлення будуць садзейнічаць наступныя практыкаванні**

| | |
|---|---|
| а) развіццё маўленчага дыхання | “Пазнай, чый голас”, “Пазнай прадмет па гуку” |
| б) фарміраванне правільнага вымаўлення гукаў | “Зліжам смачнае варэнне” , “Гадзіннік” |
| в) развіццё артыкуляцыі | “Плыві, караблік!”, “Дзьмухавец” |
| г) развіццё слыхавой увагі | прагаворванне скорагаворак, чыстагаворак |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. *Алексеева, М.М.* Методика развития речи и обучение родному языку дошкольников: учебное пособие для студентов высших и средних педагогических учебных заведений / М.М. Алексеева, В.И. Яшина. – 3-е изд., стереотип. – М. : Академия, 2000. – 400 с.

2. *Бородич, А.М.* Методика развития речи детей / А.М. Бородич. – М., 1981.

3. *Гербова, В.В.* Занятия по развитию речи в старшей группе детского сада. – М., 1983.

4. *Гербова, В.В.* Занятия по развитию речи во второй младшей группе детского сада. – М., 1989.

5. *Гербова, В.В.* Занятия по развитию речи в первой младшей группе детского сада. – М., 1986.

6. *Дубініна, Д.М.* Мастацка-маўленчае развіццё дашкольнікаў: дапаможнік для педагогаў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі / Д.М. Дубініна, Н.С. Старжынская; пад рэд. Н.С. Старжынскай. – Мінск : Зорны верасень, 2007. – С. 88.

7. *Дубініна, Д.М.* Мастацка-маўленчая дзейнасць у дзіцячым садзе / Д.М. Дубініна, Н.С. Старжынская. – Мінск, 2001.

8. *Колас, Я.* Методыка роднай мовы. Збор твораў : у 14 т. / Якуб Колас. – Мінск, 1976. – Т. 12.

9. Придумай слово. Речевые игры и упражнения для дошкольников / под ред. О.С. Ушаковой. – М., 2001.

10. Развитие речи детей дошкольного возраста: пособие для воспитателей детского сада / под ред. Ф.А. Сохина. – М. : Просвещение, 1984. – 223 с.

11. Развитие речи и творчества дошкольников: игры, упражнения, конспекты занятий / под ред. О.С. Ушаковой. – М., 2001.

12. *Соловьёва, О.И.* Методика развития речи и обучения родному языку в детском саду / О.И. Соловьёва. – М. : Просвещение, 1966. – 176 с.

13. *Старжынская, Н.С.* Займальны матэрыял па навучанню грамаце / Н.С. Старжынская. – Мінск, 1989.

14. *Старжынская, Н.С.* Развіццё маўлення дашкольнікаў / Н.С. Старжынская. – Мінск, 1993.

15. *Старжынская, Н.С.* Сябруем і гуляем разам / Н.С. Старжынская. – Мінск, 1994.

16. *Старжынская, Н.С.* Тэорыя і методыка развіцця беларускага маўлення дашкольнікаў : вучэбны дапаможнік / Н.С. Старжынская. – Мн. : Тэхналогія, 2000. – 223 с.

17. *Старжынская, Н.С.* Методыка развіцця роднай мовы: вучэбны дапаможнік / Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна. – 2-е выданне, выпраўленае. – Мінск : Вышэйшая школа, 2008. – 301 с.

18. *Старжынская, Н.С.* Беларуская мова ў дзіцячым садзе / Н.С. Старжынская. – Мн. : Народная асвета, 1995. – 159 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

19. *Старжинская, Н.С.* Обучение грамоте в детском саду / Н.С. Старжинская. – Минск, 2008.

20. *Тихеева, Е.И.* Развитие речи детей / Е.И. Тихеева. – М., 1981.

21. *Ушакова, О.С.* Методика развития речи детей дошкольного возраста / О.С. Ушакова, Е.М. Струнина. – М., 2003.

22. *Цейтлин, С.М.* Язык и ребёнок: лингвистика детской речи / С.М. Цейтлин. – М., 2000.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ЗМЕСТ

ПРАДМОВА........................................................................................3

**РАЗДЗЕЛ 1. МЕТАДЫКА ФАРМІРАВАННЯ ГРАМАТЫЧНАГА ЛАДУ МАЎЛЕННЯ** ........................................4

Лекцыя 1. Значэнне засваення граматычнага ладу мовы для развіцця маўлення дзяцей........................................4

Лекцыя 2. Фарміраванне граматычнай правільнасці маўлення дашкольнікаў ........................................7

Лекцыя 3. Метады і прыёмы фарміравання граматычнай правільнасці маўлення ........................................10

Лекцыя 4. Тыповыя граматычныя памылкі ў маўленні дашкольнікаў і шляхі іх пераадолення ........................................12

Гульні і гульнявыя заданні, накіраваныя на фарміраванне граматычнага ладу маўлення дашкольнікаў ........................................17

Пытанні для паўтарэння і абагульнення ........................................21

Тэставае заданне па тэме "Граматычны лад маўлення" ........................................22

**РАЗДЗЕЛ 2. МЕТАДЫКА ВЫХАВАННЯ ГУКАВОЙ КУЛЬТУРЫ МАЎЛЕННЯ** ........................................24

Лекцыя 1. Паняцце пра гукавую культуру маўлення. Задачы выхавання культуры маўлення дашкольнікаў ........................................24

Лекцыя 2. Фарміраванне гукавой культуры маўлення дашкольнікаў ...28

Лекцыя 3. Методыка развіцця слыхавога ўспрымання і фанематычнага слыху ў дзяцей дашкольнага ўзросту........................................30

Лекцыя 4. Навучанне правільнаму вымаўленню спецыфічна беларускіх гукаў. Работа па засваенні беларускай арфаэпіі ........................................35

Лекцыя 5. Развіццё маўленчага голасу і інтанацыйнай выразнасці маўлення. Ахова дзіцячага голасу ........................................38

Лекцыя 6. Фарміраванне маўленчага дыхання........................................42

Лекцыя 7. Арганізацыя работы па выхаванні гукавой культуры маўлення ........................................44

Гульні і практыкаванні, накіраваныя на гукавымаўленне........................................49

Практыкаванні для навучання рацыянальнаму, эканомнаму ўдыху, выдыху ў працэсе вымаўлення гукаў........................................50



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гульнявыя практыкаванні і дыдактычныя гульні
для фарміравання маўленчага дыхання....................................................51
Пытанні для паўтарэння і абагульнення ..................................................55
Тэставае заданне па тэме "Гукавая культура маўлення" ........................56

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ......................................................58

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбнае выданне

# МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ МОВЫ

Матэрыялы лекцый

У трох частках

ЧАСТКА 2

*Аўтар-складальнік*
**Грышчанкова** Алена Віктараўна

Тэхнічны рэдактар *А. Л. Пазнякоў*
Камп'ютарная вёрстка *С. А. Кірыльчык*
Карэктар *Г. В. Карпянкова*

Падпісана да друку 09.08.2021.
Фармат 60x84/16. Гарнітура Times New Roman.
Ум.-друк. арк. 3,8. Ул.-выд. арк. 4,2. Тыраж 39 экз. Заказ № 260.

Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова", 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/131 ад 03.01.2014 г.

Надрукавана ў аддзеле аператыўнай паліграфіі
МДУ імя А. А. Куляшова. 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова